БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ ГАЗЕТА

ЧЫРВОНАЯ ЧЗ ЗМЕНА

МОЛАДЗЬ І ЧАС

18 кастрычніка 1994 г.
Аўторак
№ 111 (13828)
Кошт у розніцу 25 рублёў
Выдаецца з 1921 года

У НУМАРЫ:

Малюе Віктар ДУБОВІК

"ДЗЯКУЙ ПРЭЗІДЭНТУ ЗА ХЛЕБ І МАЛАКО"

Гэтыя словы сталі дэвізам маршу, які, як вядома, правяла група студэнтаў у Мінску. Арганізатары акцыі хацелі прыцягнуць увагу адміністрацыі прэзідэнта і кіраўнікоў урада да бядотнага становішча беларускага студэнцтва. Як адзначалася ў ходзе маршу, на цяперашнюю стыпендыю можна жыць толькі на хлебе і малацэ.

Відаць, самі студэнты не чакалі такой хуткай рэакцыі ад прэзідэнта на свае беды. Ужо ўчора на бягучай сесіі Вярхоўнага Савета Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ім падпісаны ўказ, згодна з якім устанаўліваецца стыпендыя студэнтам ВНУ ў памеры 130 працэнтаў ад мінімальнай заработнай платы. Плюс да таго захоўваецца восем з паловай тысяч рублёў кампенсацыйных выплат.

А ўвогуле з першага лістапада прэзідэнцкім указам павялічваецца мінімальная заработная плата ў два разы.

Вольга ШАЎКО.

Кур'ер "ЧЗ"

ПЛАНУЕЦЦА СУСТРЭЧА ПРЭЗІДЭНТАЎ

Як стала вядома з крыніц, якія заслугоўваюць даверу, у пачатку снежня плануецца ўдзел прэзідэнта Беларусі ў сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц НБСЕ ў Будапешце.

Не выключана, што там адбудзецца першая сустрэча прэзідэнта Беларусі А.Лукашэнкі з прэзідэнтам ЗША Б.Клінтанам.

СТРАСЦІ ПА ЭФІРУ

Як вядома, учора аднавіла сваю работу сесія Беларускага парламента. Першарадную ўвагу прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі прыцягнула вядомае выступленне прэзідэнта. Між тым, у першай палове рабочага дня дэпутаты значны час удзялілі абмеркаванню пагаднення аб міждзяржаўнай тэлекампаніі "Мір", так і не дасягнуўшы згоды ў гэтым пытанні.

Біблейскі пастулат (напачатку было Слова), здаецца, добра ўсвядомлены парламентарыямі розных палітычных прыхільнасцей. Сапраўды, ва ўсіх на памяці "эфект бумеранга", які адыграў не апошнюю ролю пад час асвятлення ў СМІ прэзідэнцкай выбарчай кампаніі. Асабліва вызначылася тады нацыянальнае тэлебачанне, цалкам падкантрольнае старому ўраду, у стварэнні пэўнага іміджу свайго патрона. Аляксандр Лукашэнка здолеў лепш за іншых выкарыстаць прамы эфір, што і адбілася на выніках народнага выбару, прынамсі, павялічыла шэрагі ягонага электарату. Можна прыгадаць і нядаўняе (два тыдні таму) пікетаванне прадстаўнікамі БНФ Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі з патрабаваннем прадаставіць эфір апазіцыі. Карацей кажучы, страсці па эфіру і надалей будуць вызначацца асаблівым напалам, тым больш, калі ўзяць у разлік сённяшнія парламенцкія баталіі і набліжэнне перадвыбарчых змаганняў за крэслы ў новым ВС. Прэзідэнт сваё слова сказаў, прызначыўшы старшынёй ТРК Рыгора Кісяля, былога рэдактара "Могилевских ведомостей", любімай газеты Аляксандра Рыгоравіча (паводле ягонага прызнання зноў жа ў прамым эфіры). Дарэчы, учора тэлетайп прынёс вестку: Магілёўскае абласное тэлерадыёаб'яднанне ўзначаліў новы генеральны дырэктар Ягор Рыбакоў (правільна здагадаліся) з тых самых "Ведомостей". Што ж, вертыкаль ёсць вертыкаль. Тым часам у Авальнай зале страсці па інфармацыйнай прасторы ўчора напаліліся. Па ўсёй верагоднасці, у дэпутатаў не было ўпэўненасці, што "мірское" асвятленне падзей на Беларусі не стане крывым люстэркам, пафас выказванняў многіх народных абраннікаў заключаўся ў клопаце аб пашырэнні ўплывовасці менавіта беларускіх электронных СМІ. Мабыць, адметны акцэнт пры абмеркаванні ўзнік і па прычыне суботняга прамога эфіру астанкінскага тэлеканала для прэзідэнта, які непасрэдна ў студыі на айчынным ТБ апошнім часам (рэтрансляцыю не варта "ўлічваць") не з'яўляўся.

Якаў ЯСЭПКІН.

ПАЖАР НА "ІНТЭГРАЛЕ"

У тры гадзіны ночы 14 кастрычніка на ўчастку хіміі НВА "Інтэграл" адбыўся пажар, у выніку якога сур'ёзна пацярпела вытворчасць: два ўчасткі аб'яднання выгаралі поўнасцю, нанесены ўрон суседнім цэхам. Там пакуль прыпынена работа.

Прычыны пажару і аб'ём матэрыяльнага ўрону высвятляе спецыяльна створаная камісія.

БЕЛІНФАРМ.

МЕДАЛЬ ДЛЯ "ПЕСНЯРОЎ"

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб узнагароджанні дырэктара і мастацкага кіраўніка беларускага дзяржаўнага ансамбля "Песняры" Мулявіна Уладзіміра Георгіевіча медалём Францыска Скарыны за значны ўклад у развіццё музычнага мастацтва, прапаганду культурнай спадчыны беларускага народа.

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ "ПАТАЎСЦЕЛА"

Адкрыць для сябе невядомыя старонкі гісторыі Беларусі атрымалі магчымасць студэнты ВНУ, настаўнікі, вучні старэйшых класаў сярэдніх школ Магілёўшчыны і ўсе тыя, хто цікавіцца мінулым рэспублікі. У Магілёўскім педагагічным інстытуце імя Аркадзя Куляшова выпушчаны новы вучэбны дапаможнік, які так і называецца — "Старонкі гісторыі Беларусі".

У гэтым выданні сабраны ўрыўкі з дакументальных матэрыялаў, мемуараў, шматлікія статыстычныя звесткі аб асаблівасцях эканамічнага развіцця нашага краю, пра сацыяльную структуру насельніцтва, грамадска-палітычныя рухі і зараджэнне палітычных партый у канцы XIX і пачатку XX стагоддзяў. Аўтарам дапаможніка з'яўляецца загадчык кафедры гісторыі і культуры Беларусі, кандыдат гістарычных навук Валерый Маразевіч. Новы вучэбны дапаможнік накіроўваецца ва ўсе бібліятэкі сярэдніх школ вобласці.

ТЭЛЕКАМЕРЫ СУПРАЦЬ "НЕСУНОЎ"

Настолькі дапяклі адміністрацыю Пінскага мясакамбіната "несуны", што яна рашылася на ўстаноўку тэлевізійных камер.

З іх дапамогай кіраўніцтва спадзяецца паставіць заслон на шляху нячыстых на руку работнікаў. Акрамя таго, прынята рашэнне аб тым, што цяпер з работы будуць звальняцца не толькі самі "несуны", але і тыя, хто ім садзейнічаў у крадзяжы.

БЕЛІНФАРМ.

З БЕСПРАЦОЎЕМ БУДЗЕМ ЗМАГАЦЦА РАЗАМ

Дзяржаўную службу занятасці Беларусі наведалі з візітам прадстаўнікі Федэральнага ведамства па працы з Германіі, якія правялі ў Мінску семінар па праблемах беспрацоўя.

Нямецкія госці расказалі сваім беларускім калегам аб тых захадах, якія робяцца па зніжэнню беспрацоўя ў былой ГДР, а таксама падзяліліся вопытам па стварэнню і фінансаванню працоўных месцаў, наладжванню прыватнай дзейнасці і пазнаёмілі з сістэмай дзяржаўнай падтрымкі беспрацоўных у сваёй краіне. Такія сустрэчы беларускіх і нямецкіх супрацоўнікаў будуць мець працяг, бо практыка работы Федэральнага ведамства, на думку беларускіх спецыялістаў, шмат у чым прыдатная і пры арганізацыі занятасці беспрацоўных у нашай рэспубліцы.

Наталля Валакіда.

ВОСЕНЬСКІ "АГЕНЬЧЫК"

Праўленне калгаса "Маркава" Маладзечанскага раёна адзначыла заканчэнне хлебаробскага года своеасаблівым "агеньчыкам".

На яго запрасілі маладых калгаснікаў, якія вызначыліся на сяўбе, жніве, нарыхтоўцы кармоў. Ім былі ўручаны каштоўныя падарункі ад старшыні калгаса А.І.Сапача.

Мікола КАПЫЛОВІЧ.

Курсы валют на 17 кастрычніка:

	Даляр ЗША		Ням. марка	
	Скупка	Продаж	Скупка	Продаж
"Комплекс"	5110	5350	3285	3477
"Прыор"	5100	5500	3300	3550
"Дукат"	5250	5400	3285	3477

Багатыя плачуць — і нам не да смеху

Колькасць жадаючых з'ехаць за мяжу, здаецца, нарэшце паменшылася. Але ўсё роўна яшчэ застаецца шмат такіх, хто гадзінамі можа распавядаць пра бесклапотнае заакіянскае жыццё, з зайздрасцю прыцмокваючы языком: маўляў, "ух, ты". Хаця й ведаюць, што і там беспрацоўе і жорсткая жыццёвая канкурэнцыя, і ўзровень злачыннасці такі, што без пісталета ў жаночай сумачцы — як без памады.

І ўсё ж існуе агульная думка, што за мяжой лягчэй жывецца. Каб высветліць, ці адпавядае яна рэальнасці, я і ўзяла два інтэрв'ю.

Вользе Дубешка 18 гадоў. Нядаўна яна вярнулася з Германіі:

— Што мяне больш за ўсё ўразіла? Бадай, свабода нораваў, — разважае Вольга. — Увесь час мне здавалася, што да мяне ставяцца як да дзяўчыны пэўных паводзін, хоць я і не давала да гэтага ніякіх падстаў... А што да іхняга стылю жыцця, магу сказаць, што яны шмат працуюць, але і шмат забаўляюцца. Рэстараны, бары, дыскатэкі... Немцы значна часцей за нас наведваюць выстаўкі і канцэрты. Але я заўважыла і тое, што тэлевізар і газеты замяняюць ім кнігі. У доме, дзе жыла, я не знайшла ніводнай кніжкі — магчыма, яны недзе схаваныя, але ўсё ж чытаюць немцы вельмі мала.

— Ты лічыш, напэўна, што гэта вядзе да маральнай спустошанасці?

— Сапраўды, мне здавалася, што бліскучая мішура такога жыцця неяк тармозіць духоўнае развіццё. Яны ўвесь час занятыя сабой. Калі-нікалі мяне гэта вельмі абурала. Аднаго разу я ехала ў метро, і аднаму старому зрабілася млосна. І, уяві сабе, пакуль не з'явілася паліцыя, ніхто не паспрабаваў яму дапамагчы.

— А ты што рабіла?

— І я таксама нічога. Мовы не ведала, вось праблема!..

— Дарэчы, пра праблемы. Ці шмат іх у немцаў?

— Напэўна, нашыя жыццёвыя цяжкасці — што паесці ды апрануць — здаліся б ім смешнымі. Іх непакоіць іншае — з кім сустракацца, каго любіць. Яны быццам больш адзінокія. Там вельмі шмат акуратненькіх, добра апранутых дзядкоў і бабулек, якім, акрамя іхніх сабачак, няма каму слова сказаць. Нашыя людзі, у адрозненне ад іх, адкрыта скардзяцца на беды, не робячы выгляду, што цалкам шчаслівыя...

Такім падалося замежнае жыццё нашай дзяўчыне. Але вам цікава паслухаць каго-небудзь з "тых" студэнтаў? Калі ласка.

Юрун — наш госць з Галандыі. Яму 22 гады, але выглядае ён як вясёлы, бесклапотны хлопчык.

— Я жыву за горадам, — расказвае Юрун. — Там цудоўны пейзаж, а якое паветра!.. Разам з трыма сябрамі-студэнтамі мы здымаем домік, а ва універсітэт я езджу на веласіпедзе.

— У цябе няма аўтамабіля?

— Аўтамабіль ёсць у майго сябра, але я бачу, што гэта вельмі дорага. Вядома, што ён ніколі не пазычае нам сваёй машыны.

— Дзе ты збіраешся працаваць пасля універсітэта?

— Хутчэй за ўсё на будоўлі касмічных ракет, — адказвае хлопец і адразу ж пераходзіць на жарт: — Спадзяюся, што там мне пашчасціць уладкавацца на не вельмі цяжкую працу, напрыклад, мецці падлогу...

— У цябе ёсць уласныя жыццёвыя прынцыпы?

— Калі я быў зусім маленькім, вырашыў ніколі не курыць. Пазней прыйшоў да высновы, што не варта мець больш чым дзве сяброўкі у адзін і той жа час. Праўда, гэта не заўсёды атрымліваецца... І яшчэ адзін прынцып — заўсёды быць шчырым.

— Ці здараюцца ў цябе моманты дэпрэсіі, і калі так, то з–за чаго?

— Вядома, здараюцца, я такі ж чалавек, як і іншыя. Бывае гэта па розных прычынах: з-за дрэнных адзнак, з-за спрэчак з сябрамі, з-за нявыхаваных людзей на вуліцы...

— І што ты робіш у такія хвіліны?

— Думаю пра тое, што ўсё абавязкова наладзіцца. Я аптыміст.

— Ты, напэўна, марыш пра нешта...

— Хачу купіць дом, каб на старасці жыць на ўсходнім узбярэжжы Францыі. Пакуль што я толькі адпачываю там кожнае лета.

Што ж, у кожнага з нас свае праблемы...

Вольга ДЗЯЦЮК.

ДЗЕВЯТАЕ НЕБА

"Супер чэннэл"

ПАРЫЖ НЕ АДАБРАЕ ЗША

Урад Францыі не скрывае свайго неадабрэння праводзімай ЗША эскалацыяй на іракa–кувейцкай граніцы.

На думку міністра замежных спраў А.Жупе, на крызіс у Персідскім заліве не трэба "звышрэагаваць". Французскае кіраўніцтва напрамую звязвае "дэманстрацыю сілы" Пентагонам з імкненнем адміністрацыі ЗША дабіцца папулярнасці ў амерыканцаў.

ІТАЛЬЯНЦЫ БАСТУЮЦЬ

У Італіі прайшла ўсеагульная забастоўка супраць пастаяннага пагаршэння жыцця ў краіне.

Галоўнымі патрабаваннямі, якія бастуючыя прад'явілі ўраду, сталі зніжэнне падаткаў, платы за навучанне ў ВНУ і за медыцынскае лячэнне, а таксама "размарожванне" пенсій.

"Еўраньюс"

ДАПАМОГА СУСЕДЗЯЎ

Японія прыняла рашэнне аказаць гуманітарную дапамогу жыхарам Курыльскіх астравоў, якія пацярпелі ад землетрасення. Ім будуць накіраваны грузы з прадуктамі харчавання, медыкаментамі і прадметамі першай неабходнасці.

СВАБОДА СЛОВА – ПАД ПАГРОЗАЙ

Прадстаўнік ЗША выступіў перад удзельнікамі канфедэрацыі НБСЕ ў Будапешце, на якой выказаў сваю занепакоенасць з прычыны пагрозы свабоды друку ў Еўропе.

Амерыканскі дэлегат указаў не толькі на законы, якія абмяжоўваюць дзейнасць сродкаў масавай інфармацыі, але і прывёў факты фізічнага насілля ў адносінах да журналістаў.

"Уорлднэт"

ЗАГАДАНА АЧУНЯЦЬ

Дэйву Сцюарту давялося спыніць займацца музыкай пасля таго, як ён трапіў у бальніцу ў Дубліне са скаргамі на боль у плячы.

Калі гэта здарылася, гітарыст быў у Ірландыі. Яго шпіталізавалі, але музыкант адмовіўся прайсці поўны курс лячэння. Сцюарту, які вядомы як адзін з самых працавітых людзей у свеце рок-музыкі, было загадана спыніць работу да поўнай папраўкі здароўя.

КЛІНТАН УЗНАГАРОДЗІЎ АРТЫСТАЎ

Прэзідэнт Амерыкі Біл Клінтан узнагародзіў акцёра і спевака Хары Белафанта, джаз–музыканта і кампазітара Дэйва Брубека, спевака і танцора Джэна Келі. Яны ўвайшлі ў лік 12 артыстаў, якія ў 1994 годзе былі ўзнагароджаны нацыянальнымі медалямі за мастацтва.

"TV -5"

ПРЫСВЯЧАЕЦЦА АХВЯРАМ КІДНЕПІНГА

Музыканты групы "Emerson, Lake and Palmer" збіраюцца ахвяраваць даход ад сваёй новай песні "Daddy" ў дапамогу прапаўшым дзецям і ахвярам кіднепінга.

Грошы пойдуць у Нью-Йоркскі цэнтр імя Сары Эн Вуд. Ён атрымаў сваю назву ў гонар 12-гадовай ахвяры кіднепінга, якую забілі ў мінулым годзе. Грэг Лейк, аўтар песні, унясе свой асабісты ўклад у памеры 5 тысяч даляраў. Паводле слоў музыканта, гісторыя Сары ўсхвалявала яго, бацьку маленькай дачкі, і прымусіла напісаць гэту песню.

Дзяжурныя па выпуску
перакладчык
Ларыса ДУДАРЫК,
ЛюдмілаКАХАВЕЦ,
рэдактар
НаталляВАЛАКІДА.

ПАВЕДАМЛЕННІ, АТРЫМАНЫЯ ПА КАНАЛАХ СПАДАРОЖНІКАВАЙ СУВЯЗІ "ЧЫРВОНАЙ ЗМЕНЫ"

БІЗНЕС-КЛАС

ПРА РЭАРГАНІЗАЦЫЮ ПРЫВАТЫЗАЦЫІ

Расшыранае пасяджэнне калегіі Міндзяржмаёмасці было прысвечана аднаму з самых актуальных пытанняў — прыватызацыі. У дакладзе намесніка міністра Васіля Давыдзенкі і ў іншых выступленнях адзначалася неабходнасць актывізацыі яе правядзення. У гэтым годзе з 375 аб'ектаў рэспубліканскай уласнасці, намечаных да раздзяржаўлення і прыватызацыі, рэфармавана толькі 145. І хоць сярод іх ёсць такія буйныя, як Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод, вытворчыя аб'яднанні "Лідсельмаш", "Мастадрэў", гродзенскае "Хімвалакно" і іншыя, за апошнія некалькі гадоў прыватызавана толькі чатыры працэнты дзяржуласнасці.

Наспела неабходнасць унесці змяненні ў законы аб арэндзе, аб прадпрыемстве і іншыя. На сённяшні дзень не дзейнічае Закон аб банкруцтве. Аказала ўплыў на актыўнасць людзей і перадвыбарная прэзідэнцкая кампанія, паколькі ў праграме амаль кожнага прэтэндэнта змяшчалася крытыка ў адрас прыватызацыі. Усё гэта прывяло не толькі да яе замаруджвання, але дзе-нідзе і да прыпынення.

На пасяджэнні было адзначана, што галоўная ўвага пры перадачы дзяржмаёмасці ў прыватныя рукі будзе звернута цяпер на правядзенне аўкцыёнаў, дзе кожны ў адкрытай абстаноўцы зможа набыць акцыі прадпрыемстваў і за чэкі, і за грошы.

ІСЛАМСКІЯ ТРАДЫЦЫІ – НЕ ПЕРАШКОДА БІЗНЕСУ

Прадстаўнікі дзелавых колаў Ірана прыбудуць у Мінск для правядзення міжнароднай выстаўкі-продажу тавараў народнага спажывання. Іранскія вытворцы і дылеры размесцяць сваю прадукцыю на экспазіцыйных плошчах Палаца спорту з 20 па 30 кастрычніка.

33 фірмы прапануюць беларусам экспазіцыі адзення, абутку, тканін, асвятляльнага абсталявання, мэблі, пральныя сродкі, дываны і вырабы ручной работы, а таксама прадукты харчавання.

БЕЛІНФАРМ.

ГАЛАНДСКАЯ НАВІНКА ДЛЯ НАШАЙ ВЫСТАВЫ

У Рэспубліканскім выставачным цэнтры прайшла міжнародная выстаўка "Кансімекс-94", якая прадстаўляла тавары народнага спажывання на экспарт. 70 фірм з 15 краін, сярод якіх такія вядомыя, як "Бош", "Лонда", "Матадор", узялі ўдзел у выстаўцы.

Сярод удзельнікаў была і галандская фірма "Філіпс". На гэты раз яна прадставіла сваю прадукцыю шырокім асартыментам. Пераважалі ў ёй электроніка і бытавыя прыборы. Навінкай стала дэманстрацыя тэлевізараў серыі "Паўэрвіжн-3".

БЕЛІНФАРМ.

ДЗЕ НАБЫЦЬ НЕДАРАГІ АБУТАК?

Нядаўна ў Мінску адкрыўся новы абутковы магазін мінскага акцыянернага таварыства "Прамень".

Магазін прапануе мужчынскі, жаночы і дзіцячы абутак на любы сезон. Цэны крыху ніжэйшыя, чым у гарадскім гандлі. Заўважым, что рыхтуецца да адкрыцця яшчэ адзін фірменны магазін аб'яднання "Прамень".

А.ГЕРАСІМАЎ.

УНІВЕРСІТЭЦКАЯ КАФЕДРА

Россып зорак

Творчы партрэт студэнтаў факультэта журналістыкі

Сябры-калегі часта пытаюцца ў мяне: якія яны сённяшнія студэнты?

— Цудоўныя, — адказваю. — Вельмі таленавітыя, працавітыя і да вучобы здольныя...

Мае субяседнікі іншы раз сумняваюцца. Падстаўна даводзяць, што іх былы курс быў самым лепшым і сярод многіх пакаленняў выпускнікоў найбольш знакамітым. Я згаджаюся, бо добра ведаю, што кожны выпуск універсітэцкага журфака мае свой россып зорак: майстроў-публіцыстаў, народных пісьменнікаў, народных дэпутатаў, дактароў навук. Ганаровых званняў не пералічыць! І з такімі доказамі нельга не пагадзіцца. Гэта ўжо, як кажуць, гістарычны факт. Такі шчаслівы лёс факультэта журналістыкі — даваць моцныя крылы сваім выпускнікам для высокага палёту.

Таму я даволі лёгка пераконваю сваіх недаверлівых апанентаў у тым, што сённяшнія студэнты — гэта не "згубленае" пакаленне, не спажывецкі хор ля дармавога пірага, а маладыя моцныя галінкі ўквечанага дрэва творчасці, якое за пяцьдзесят гадоў узгадавана на факультэце журналістыкі.

Тым больш, што важкіх довадаў сярод шасцісот студэнтаў можна знайсці даволі многа. Прыгадваю тых юнакоў і дзяўчат, хто памечаны ўдачай творчасці, каму навука стала шчаслівым прадаўжэннем мары. Упэўнены, што толькі такім чынам можа расквітнець талент.

На другім курсе вучыцца Алеся Унукоўская. Усмешлівая, сціплая, прыгожая і ў працы ранняя. Алеся прафесійна працуе на восьмым канале вядучай тэлепраграм. І так шчыра, зацікаўлена і ўзнёсла захапляецца сваёй любімай працай, што вопытныя тэлевізійшчыкі могуць пазайздросціць. Калі не ў сэнсе пераймання вопыту, дык з боку шчырасці, прывабнасці на экране, зацікаўленасці да той размовы і дзеяння, што адбываецца на вачах гледачоў.

Думаецца, што ў характары Алесі Унукоўскай арганічна ўз'ядналіся жаданне вучыцца і працаваць. А гэта галоўнае для творчага чалавека. Што яшчэ можна жадаць і патрабаваць ад студэнткі толькі другога курса? Радавацца яе поспехам і дапамагаць развіваць яе тэлевізійны талент.

І няхай не закране лёс Алесі Унукоўскай даволі распаўсюджаная асцярога: студэнт амаль з першага курса зоркай прыходзіць у рэдакцыю, заўзята працуе там на ўзроўні пачатkoўца, а потым нікне ад недахопу ведаў і вопыту ў агульнай атмасферы пасрэднага прафесійнага ўзроўню. На жаль, гэта здараецца часта і балюча для маладых журналістаў і іх настаўнікаў.

Аднак пакуль "брава", Алеся, і патрэбна чакаць пасля пятага курса акрыляючага — "біс"!

Сашу Новікаву, цяпер студэнтку трэцяга курса, "заўважылі" на працы ў калгасе. Студэнцкая "бульба" мае цікавую магчымасць праяўляць людзей. Нездарма існуе павер'е, што праца на калгасным полі — гэта падмурак для студэнцкай дружбы.

Для Сашы, гарадской дзяўчыны, нескладана было працаваць на баразне, згатаваць боршч і грыбоў насмажыць на цэлы студэнцкі ўзвод. Прычым без прымусу, хаця праца на бульбяным полі, ды яшчэ пад пастаянным душам пранізлівага дажджу, — не асалода для маладых людзей.

Адкрыццё Сашавых сакрэтаў адбылося даволі хутка. Выкладчыкі і студэнты загаварылі пра гэту ўдумлівую і старанную дзяўчыну. А зусім нядаўна маладая паэтэса Саша Новікава падарыла сваім сябрам і выкладчыкам сваю першую кніжку вершаў.

Зразумела, што гэта поспех. Але галоўнае тут тое, што паэтычны талент праявіўся на ранняй стадыі свайго станаўлення. Саша Новікава знайшла архімедаву кропку апоры, каб перавярнуць глыбу паэзіі і знайсці магчымасць сказаць сваё аўтарскае слова.

Такім чынам, журфак паэтычна працягвае свае сталыя традыцыі ў беларускім мастацтве.

Карманаў Юра з аршанскіх рабочых. У постаці гэтага высокага інтэлігентнага юнака, студэнта чацвёртага курса, адчуваецца нешта ўстойлівае, пэўная сіла яго характару. Можа гэта і вывела яго на самую мудрую і сталую газету: Юру лічаць "звяздоўцам". Яго асноўныя матэрыялы прысвечаны актуальным праблемам развіцця нашай рэспублікі.

У творах маладога публіцыстаназіраецца сталая ідэя. Ён лічыць, што беларускую эканоміку і культуру можна развіваць без прымусу і панукання, а толькі ў агульнанароднай згодзе.

Асоба Юрыя Карманава ў студэнцкім асяроддзі цікавая сваёй навізной. У сучаснай вышэйшай школе эмацыянальны заклік да выдатнай вучобы заменены неабходнасцю мець грунтоўныя веды. І гэта разумее большасць студэнтаў. Ва ўмовах канкурэнцыі прафесійнага майстэрства атрымаць грунтоўны навуковы фундамент будучай прафесіі можна толькі ва ўніверсітэце. Для творчай працы, для журналісцкай прафесіі — гэта самы галоўны закон дзеяння. Гавораць так: творчасць заўсёды ад Бога, але толькі праз мазольную працу.

Такія студэнты, як Юра Карманаў, зрабілі адзіна правільны выбар: веды — каштоўнасць найкаштоўнейшая.

У вёсцы Бялевічы Глыбоцкага раёна нарадзіўся Іван Кобзік. Вучоба ва ўніверсітэце была ўзнёслай марай, і навука захапіла яго, але яшчэ больш прываблівай аказалася праца на радыё ў "Беларускай маладзёжнай", дзе Іван асталяваўся амаль з першага курса.

Адметна, што студэнт прафесійна рос не толькі ад курса да курса, але і з кожным сваім матэрыялам, чарговай радыёперадачай. Пазбаўлены вычурнасці, канкрэтны і праўдзівы, без зазнайства, але, адчуваючы сваю годнасць чалавека і журналіста, да пятага курса Іван Кобзік назапасіў сталы вопыт прафесійнай працы.

Можна адзначыць, што гэта публіцыст новага пакалення па сутнасці творчасці, якое не абмежавана нейкімі заказнымі інтарэсамі, уціскам палітычных плыняў і груповак. Патрабаванне новага асэнсавання рэчаіснасці ідзе ад інтарэсаў беларускага народа, ад вострай неабходнасці хуткага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Гэта шлях і да свабоды творчасці, яе вялікай грамадскай каштоўнасці. Студэнты гэта добра ўсведамляюць.

Колькі такіх, а можа яшчэ і больш адметных, маладых творчых юнакоў і дзяўчат на факультэце журналістыкі. Усіх не пералічыш. Але чытачы, гледачы і слухачы нашай рэспублікі кожны дзень сустракаюцца з імі і запамінаюць іх імёны.

Зразумела, што гэта больш адносіцца да студэнтаў старэйшых курсаў. А што цікавага на першым? Пяцьдзесят дзевяць студэнтаў маюць не толькі накіраванні з рэдакцый газет, але і цікавыя матэрыялы. Ёсць былыя штатныя супрацоўнікі раённых і нават рэспубліканскіх газет, нягледзячы на юны ўзрост.

Многія першакурснікі супрацоўнічалі на радыё, тэлебачанні, прынеслі ў прыёмную камісію свае мастацкія творы, у асноўным вершы.

Можна сцвярджаць, што на першым курсе ёсць творчы падмурак, які вельмі хутка праявіцца ў беларускай публіцыстыцы, паэзіі і прозе.

Ва ўніверсітэце на пачатку гэтага месяца прайшла навуковая канферэнцыя, прысвечаная 50-годдзю журфака. На ёй выступіла не толькі прафесура, але і супрацоўнікі сродкаў камунікацый. Было радасна ад патрыятычнай зацікаўленасці ўдзельнікаў у станаўленні прэсы, радыё, тэлебачання ў новых умовах і выкананні імі адзінай мэты — пабудовы заможнага грамадства ў Рэспубліцы Беларусь. Гэта маладая інтэлектуальная сіла, за якой будучае нашага народа, вырастае на факультэце журналістыкі БДУ.

Алег СЛУКА, прафесар, дэкан факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта.


ДАБРАЧЫННАСЦЬ



Лайф і Фрыд Слінгстад прыехалі ў Беларусь упершыню. І адразу з дапамогай пацярпелым у выніку чарнобыльскай катастрофы. Вельмі ўразіла нарвежскіх гасцей паездка ў Клімавічы, наведанне дзіцячага гематалагічнага цэнтра. Пасля вяртання на радзіму яны распачнуць кампанію ў прэсе, якая дапаможа наладзіць збор больш пашыранай дапамогі на Беларусь. На радзіме іх чакае і святочная падзея. За шматгадовую дабрачынную дзейнасць Лайф Слінгстад будзе ўзнагароджаны медалём, які яму ўручыць кароль Нарвегіі.

Фота Сяргея БРУШКО.





На беразе Вілейскага вадасховішча пачаў сваю дзейнасць узорна-аздараўленчы цэнтр "Надзея". Ён створаны па ініцыятыве Дзяржкамчарнобыля Рэспублікі Беларусь, фонду "Жыццё пасля Чарнобыля", нямецкага камітэта "Лебен мах Чарнобыль" і арганізацыі "Менерарбайт" Евангельскай царквы Германіі, прычым актыўны ўдзел у фінансаванні прыняў Гесенскі зямельны ўрад. Паводле папярэдніх даных, на будаўніцтва цэнтра ўжо выдаткавана двума бакамі каля 4 мільёнаў марак.

У перспектыве "Надзея" будзе прымаць у адну змену, працягласцю 8 тыдняў, да 300 чалавек, а ў год – 1800.

Віктар НАБЯРЭЖНЫ.

ЗАМАЛЁЎКІ З НАТУРЫ

Пратэст

Старшыня калгаса адмовіўся будаваць на цэнтральнай сядзібе сталовую. На яго як толькі ні націскалі, але ён сваё: "Не трэба яна нам!"

Я невыпадкова сустрэўся з гэтым старшынёй — параілі ў райвыканкаме "прапясочыць", мо тады хоць, калі ў газеце крытыкнуць за адсталы погляд на жыццё, адумаецца. Мы сядзелі ў даволі сціплым кабінеце, і старшыня, пыхкаючы папяроскай, даказваў:

— Гатуй дома боршч, Мар'я! Для чаго ў цябе печ? Для чаго газавая пліта? Агарод для чаго? Ну, адкрыем мы сталоўку. Гарантую — міне час, не адразу, канешне, і мы не знойдзем у вёсцы ніводнай сапраўднай гаспадыні. Перавядуцца. І дапаможа ім у гэтым мая сталоўка. Будуць і самі хадзіць жанчыны туды есці, і мужыкоў пасылаць. Нешта мы ўжо дужа азартна вёску пад горад падбіваем. А ці трэба? Вёска павінна заставацца вёскай. Прайдзіце па хатах, знайдзіце маслабойку. Дарэмна! Прывозяць у магазін, людзі ўжо даўно сваё не робяць. Лянуюцца. Хоць наша, сялянскае, і смачнейшае было... Ёсць зерне? То-та ж!

А дзе мне ўзяць людзей, каб пасадзіць іх у сталоўцы? Чатыры жанчыны, як мінімум, дай. Добра, загітуем выпускніц, пагодзяцца тыя — дазваляю такі ход, хоць і сумняваюся. Будуць сядзець яны ў цёплым месцы, а маткі іх, старыя заслужаныя людзі, няхай пад дажджом працуюць? Не, не справа гэта. Распускаць не трэба маладых. Я ж наперад гляджу. Уявім наступнае. Стане раптам мая вёска ў адзін рад з тымі, дзе ўжо сёння ў сталоўцы есці няма каму. Зачыняць? Зачыняць. А куды я тых дзевак падзену? Хіба ж яны пасля той цёплай работы на ферму пойдуць? Ніколі. І ў горад позна ехаць. Сям'я, дзеці... Прападуць дзеўкі.

Не, я не супраць прагрэсу. Але меру ведаць трэба. Я не здзіўлюся, калі мне паставяць задачу пусціць па вёсцы таксі. Хвядоса вазіць да Петрака, а Петрака — да Хвядоса. У госці. Не пагаджуся — успомняць пра ранейшыя грахі... Ты думаеш, я адразу пагадзіўся і КБА адкрываць? Дзе там! Націснулі, на лапаткі паклалі. А мне ж лягчэй і зручней было пасадзіць людзей у аўтобус, адвезці ў горад: абшывайцеся, землякі, на здароўе! Многа яны, вяскоўцы, і шыюць, гляджу. А людзей забралі... Сваіх жа ў камбінат не прыслалі з горада. Мае. З залатога фонду. Вунь яны, вунь нюхаюць бэз пад камбінатам... Таму навучаны. Так-та! А калі ты прагаладаўся, я накармлю: жонка ў мяне смачна гатуе. Ну дык што, паабедаем? І мне весялей будзе.

Я часта ўспамінаю таго старшыню. Чую яго імя па радыё. Сустракаю ў газетах. Хваляць.

Цікава, пабудаваў ён усё ж сталовую ці не?

Дом

Чатыры сыны майго знаёмага Мацвея Міхайлавіча Чэкана. Волаты-хлопцы. Старэйшы? Аляксей, першы праклаў дарогу ў горад. Жыве ў Гомелі, працуе на заводзе. За ім паехалі і яшчэ двое, Павел і Сяргей. Дома застаўся толькі малодшы — Яша. Адслужыў ён у арміі, робіць на трактары. "Хоць адзін пры мне, і тое добра",— радаваўся бацька. Нядаўна Яша ажаніўся, прывёў у хату вясковую прыгажуню Насцю. Жывуць.

— Ты вось што, сын,— сказаў неяк Мацвей Міхайлавіч,— будавацца думаеш ці не? Трэба, трэба. Хатка ў нас старая, сам бачыш, цесная. На твой век яе ўсё роўна не хопіць, так што калі-небудзь трэба пачынаць. Лепш цяпер, у маладыя гады. Ды і я падсаблю...

Сын здзівіўся:

— Навошта мне хату будаваць? Калгас вунь хутка будзе здаваць катэджы. Для нас, маладых. Гатовенькі дом бяры ды і жыві!

— Э, не,— крутнуў галавой стары.— Так не пойдзе справа. Як жа ты будзеш заўтра, калі сёння табе дом адразу? Не, сын мой, не. Лёгка жыць пачынаць — жыць таксама кепска. Спярша солі лізнуць трэба, а тады ўжо цукру. А ты паспрабуй наадварот? Цукар нясмачны будзе. Так-та! Ды і дом, калі мазалём дастанецца, тады ён навечна твой будзе, моцна ўрасцеш у нашу зямельку. А той, калгасны, хоць і прыгожы, але ўсё роўна чужы. Яго лёгка кінуць. Ён як інтэрнат. Сёння ты пераначаваў, заўтра іншы хто. Не, сын, будзем дом для цябе будаваць. З бярвёнаў. Пад шыферам. Хлеў побач паставім. Жыць дык жыць!

Мацвея Міхайлавіча многія палічылі ў вёсцы дзіваком: забараніў жыць у калгасным доме сыну — і хоць ты што!

Звіняць у Стараселлі сякеры, спявае піла, хораша пахне смалой. Будуецца дом.

Бацька

Ліст ад сына адзінокі дзядзька Мітрафан атрымаў на нейкае свята. Стары быў пад добрай "мухай" і, паколькі жыў адзін і не было яму каму пахваліцца радасцю, хадзіў з хаты ў хату, трос кашчавай рукой:

— Пісьмо! Ад Сашкі! Жэніцца, каб яму! Гарадскую, відаць, мымру там абкруціў! Вось вам і Сашка! А вы з садоў яго ганялі! А-а-а! — І жартаўліва пагражаў аднавяскоўцам жоўтым ад папяроснага дыму пальцам.— На вяселле заве! Паеду! А як жа — паеду-у!

На вяселле Мітрафан не паехаў, на другі дзень ён і ўвогуле пра яго не ўспамінаў. Так і цягнуліся дні. І раптам прыходзіць яшчэ адно пісьмо. Мітрафан на гэты раз быў цвярозы і ўжо не хадзіў па хатах, а толькі бурчэў сабе пад нос:

— Ён жа халасцяк, Сашка. А як зразумець — "павіншуй з унукам"? Цьфу!

Пазней Мітрафан выпадкова знайшоў тое пісьмо. І жахнуўся:"Яна ж, гарэлка, і не тое можа зрабіць з чалавекам. Адзінага сына па-людску жаніць не атрымалася...". Выцер слязу.

З таго дня не п'е. Ні кроплі.

Рама

Сяргей Пятровіч атрымаў новую кватэру. Не нарадуецца. Тры пакоі, прасторная кухня, мала чым уступае зале калідор. Толькі адно засмуціла старога рабочага: балкон — хоць у футбол гуляй, а карысці з яго пакуль ніякай. Толькі што вунь снег збірае, дождж сячэ па ім. І ён рашыў зрабіць раму, зашкліць яе — тады будзе парадак. Як у людзей. Схадзіў да суседзяў, паглядзеў, як робяцца тыя рамы, з добрым настроем узяўся за работу.

— Ты б, Пятровіч, раз'ёмную раму рабіў,— ішоў побач знаёмы, задраў галаву, пацікавіўся, чым займаецца чалавек.— Калі зняць яе прымусяць — хутка атрымаецца: адкруціў гайкі, выцягнуў балты — і гатова.

— А навошта...знімаць?— насцярожыўся Пятровіч.

— Дык ты хіба не ведаеш, што забаронена рамы ставіць?

— Не.

— Нельга, нельга, Пятровіч. Мне было. Вось памяркуй: ты, значыць, такога фасону раму зробіш, сусед — іншага, ды яшчэ пафарбуеце ў розны колер. На цыркавы манеж будзе дом падобны.

Задумаўся Сяргей Пятровіч: праўду гаворыць.

— Паслухай, а я ж раблю так, як мне лепш,— сказаў.— Я ж... Калі б не трэба была на балконе рама, няўжо б я за яе браўся? Планую тут такія-сякія рэчы паставіць. Скрынку з бульбай хоць бы. Сам жа ведаеш — падвала ў доме няма. Газеты збіраю... Ты ж ведаеш, што ў нас на пятым паверсе пажар быў. Акурат нехта кінуў з шостага ці сёмага паверха, і на балконе паперыны ўспыхнулі. Ну. Я ж, як лепш, хачу.

— Я-то разумею...

Сяргей Пятровіч стукаў далей малатком — рабіў раму, а знаёмы пайшоў сваёй дарогай. Праз тыдзень недзе, калі была гатова рама і атрымала заслужаную пахвалу ў суседзяў, нехта пазваніў у дзверы.

— Зніміце раму!— строга загадала жанчына, ваяўніча пазіраючы на гаспадара кватэры.— Інакш возьмем міліцыянера і разаб'ём-разламаем!

Ён не зняў раму. Прыйшла брыгада актывістаў, быў сярод іх і міліцыянер, павыбівалі амаль усе шыбы. Сяргея Пятровіча дома не было.

Назаўтра ён зноў шкліў раму. Ён і суседзі.

...Быў у Чарнігаве. Выязджаючы з горада, убачыў дом, які вось-вось павінен прыняць жыхароў. Заставалася толькі памыць вокны. На балконах жа былі рамы. Усе аднаго колеру, аднаго фасону.

Побач, здаецца, жывём, а крышачку не так...

Васіль ТКАЧОЎ.

ЛЁС ГАДУЦІШАК ВЫРАШАНЫ

У Гродна 13 кастрычніка адбыўся чарговы раунд перагавораў па дэлімітацыі і дэмаркацыі беларуска-літоўскай граніцы.

Як паведаміў кіраўнік дэлегацыі нашай рэспублікі намеснік міністра замежных спраў Станіслаў Агурцоў, цэнтральным у час перагавораў было пытанне аб чыгуначнай станцыі Гадуцішкі. У выніку бакі прыйшлі да згоды па праекту лініі граніцы ў гэтым раёне. У адпаведнасці з дамоўленасцю, Беларусі адыходзіць асноўны чыгуначны пуць і тры дапаможныя. Літва атрымлівае будынак чыгуначнага вакзала і адзін, які мяжуе да яго, дапаможны пуць.

У ходзе перагавораў бакі канкрэтызавалі таксама дагаворанасці па іншых прыгранічных участках, размешчаных на тэрыторыі Гродзенскай вобласці.

Наступны раунд беларуска-літоўскіх перагавораў намечаны на 26 кастрычніка ў Вільнюсе.

МАСКВА–БРЭСТ: СКОРАСНЫ РУХ

Міністэрства шляхоў зносін Расіі прыняло рашэнне падвоіць хуткасць пасажырскіх паяздоў, якія накіроўваюцца на Захад.

Як паведаміў начальнік Беларускага вакзала Уладзімір Бараўкоў, Беларуская чыгунка аказалася найбольш падрыхтаванай да эксперымента. Таму вырашана на працягу наступнага года падрыхтаваць участак дарогі Масква—Смаленск—Орша—Мінск—Брэст да скораснага руху. Мяркуецца давесці хуткасць да 80, а на асобных участках — 120—160 і нават 200 кіламетраў у гадзіну. Тым самым, напрыклад, час у дарозе ад Масквы да Мінска скароціцца з 12 гадзін да 8.

БЕЛІНФАРМ.

"БУЛЬБУ ЎСЕ МЫ ПАВАЖАЕМ..."

Добры апетыт на бульбу ў некаторых нашых суграмадзян, асабліва на дармавую. Вось і днямі са сховішча цэха грамадскага харчавання Асіповіцкага завода аўтаагрэгатаў знікла 500 кілаграмаў адборных клубняў.

Цікава, што заўважылі прапажу толькі пасля чатырох выхадных.

Іван СЦЯПУРА.

КРЫМІНАЛЬНЫ КВАРТЭТ

Чатыры злачынцы нядаўна спынілі на дарозе ў Іўеўскім раёне аўтобус "Мінск—Варшава". Яны пасадзілі за руль аднаго з удзельнікаў банды, а "на хвост" "Ікарусу" — крадзеную "Волгу". Затым пачалі абшукваць сумкі і адзенне пасажыраў, "экспрапрыіруючы" ўсю знойдзеную валюту.

Калі людзі заўпарціліся, адзін з рабаўнікоў выстраліў з драбавіка па абшыўцы аўтобуса, у выніку чаго было лёгка паранена некалькі чалавек. Пасля вобыску бандыты зніклі.

Ужо праз паўгадзіны Іўеўская міліцыя пачала пошук злачынцаў. У хуткім часе далучыліся супрацоўнікі з Лідскага, Навагрудскага і Воранаўскага раёнаў. Ноччу бандыты былі затрыманы.

Лілія АСТРАВЕЦКАЯ.

Кур'ер "ЧЗ"

ГАРУЧАЕ З... РАПСУ

Гаручае са звычайнага рапсу паявіцца хутка ў аўтапарках рэспублікі. Звярнуць увагу на гэту агракультуру транспартнікаў прымусіў пастаянны паліўны голад, які Беларусь зведвае ў апошні час.

Ідэя прымянення рапсавага алею ў якасці паліва не новая. У 60-я гады ў нашай рэспубліцы на такім гаручым працавалі многія дызелі. Але затым неабходнасць у гэтым адпала. І пра рапс забыліся.

Сёння вучоныя і спецыялісты БЕЛНДІТ па пясчынцы збіраюць інфармацыю аб выкарыстанні альтэрнатыўнага паліва ў ЗША і краінах Заходняй Еўропы, а заадно "ажыўляюць" у памяці і тое, што рабілася ў Беларусі. На іх думку, аўтапрадпрыемствы толькі выйграюць ад таго, што будуць выкарыстоўваць такое паліва. Выгадна гэта будзе і рэспубліцы ў цэлым, паколькі вырошчваць рапс можна і на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях.

ПАДАРЫЛА МАЦІ СЫНУ ГРАНАТУ...

На аўтавакзале Бягомля была прыпынена гандлёвая дзейнасць М., які спрабаваў прадаць баявую гранату.

Прывезла яе сыну, які, дарэчы, знаходзіўся пад наглядам, маці, настаўніца адной са школ Вілейкі. Маці і сын затрыманы.

ПАЙШЛІ Ў ХОД І РОГІ, І КАПЫТЫ

Практычна безадходнай тэхналогіі дасягнуў Віцебскі мясакансервавы камбінат. Акрамя традыцыйных відаў вырабаў, тут пачалі выпускаць коўдры і падушкі, набіваючы іх воўнай. Рогі выкарыстоўваюць для пано, цудоўны корм для жывёлы атрымліваюць з сапрапеляў і касцей.

А некаторыя віды прадукцыі карыстаюцца цяпер павышаным попытам. Калі раней супавыя наборы і рагу гандаль заказваў толькі сотні кілаграмаў, то цяпер і штодзённых васьмі тон малавата.

БЕЛІНФАРМ.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

ДЫПЛОМ, ЯКІ ПРЫЗНАЮЦЬ ВА ЎСІМ СВЕЦЕ

"Сябры мяне пераконваюць у тым, што пры жаданні і наяўнасці сродкаў сёння магчыма свабодна паехаць вучыцца на Захад. Мовяць, што гэта дае магчымасць атрымаць дыплом, які прызнаюць ва ўсім свеце. Ці так гэта?

П.СОПНЕЎ, г.Дзяржынск".

Гэты навучальны год упершыню, здаецца, з 1917 года характэрны тым, што беларусы могуць свабодна вучыцца ў замежных ВНУ. Няма больш парткомаў і двухгадавых праверак на добранадзейнасць. Праўда, больш высокім бар'ерам сталі грошы (дакладней, іх адсутнасць).

Апошняе дастаткова важна: не кожны можа дазволіць сабе выбіраць паміж універсітэтам у Мінску і універсітэтам на Захадзе. Затое будучы спецыяліст набывае там не толькі найлепшую адукацыю, але і веданне мовы, знаёмствы на заходнім рынку працы. Перш за ўсё, ён атрымае дыплом, які прызнаюць ва ўсім свеце, акрамя таго, з ім можна ўладкавацца на працу ў любой краіне. Але гэта датычыць не кожнай ВНУ. Існуе вызначаны спіс навучальных устаноў усяго свету, якія прызнаюць у якасці надзейных і рэкамендуемых студэнтам. Праўда, у гэтым спісе практычна няма ні беларускіх, ні расійскіх ВНУ, якія даюць міжнародна прызнаныя дыпломы.

МЕДАЛЬ У ГОНАР ЮБІЛЕЮ

"Набліжаецца свята 50-годдзя Перамогі над фашысцкай Германіяй. У гонар гэтага юбілею Расія заснавала медаль. Ці будуць узнагароджвацца ёю ўдзельнікі вайны, якія жывуць у іншых рэспубліках СНД?

В.СОТНІКАЎ, г.Мінск".

У адміністрацыі прэзідэнта Беларусі нам паведамілі, што медалі ў гонар юбілею Перамогі павінны атрымаць усе ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны — ветэраны баявога і працоўнага франтоў. Напрыканцы мінулага года вышэйшыя кіраўнікі краін СНД на сустрэчы ў Ашхабадзе прызналі гэты медаль, заснаваны Расіяй, агульнай узнагародай для ўсіх краін Садружнасці. У цяперашні час медалі робяцца на маскоўскім Дзяржзнаку, прычым кожная дзяржава павінна будзе выкупіць сваю частку заказу. Нягледзячы на тое, што ўсе медалі будуць аднолькавага ўзору, кожная рэспубліка Садружнасці прысвоіць іх указам свайго прэзідэнта і ўстановіць асабістую форму ўзнагароднага пасведчання. Усяго плануецца выпусціць каля 10—12 мільёнаў юбілейных узнагарод.

ХАЧУ, ЯК АЛА ПУГАЧОВА...

У мяне, што называецца, лішняя вага. Дапамажыце ад яе пазбавіцца! Вось толькі не патрэбна мне пра гімнастыку, шэйпінг, аэробіку... Пугачова ж прывяла сябе ў парадак без усялякага спорту!

В.КРУПКІНА,г.Віцебск.

Ну, калі Вы не хочаце ні шэйпінгу, ні гімнастыкі — значыць вам патрэбна эстэтычная медыцына. Праўда, у нас ліпаэкстрацыя ці ліпаскультура робіць толькі першыя крокі. Ад лішняга тлушчу пазбаўляюцца пры дапамозе спецыяльнага зонда, які ўводзіцца ў маленькі пракол на скуры і злучанага з адсмоктвальнікам. Аперацыя робіцца пад мясцовай анестэзіяй. Дарэчы, гэтая аперацыя магчыма не толькі для поўных людзей, але і для тых, у каго пры дастаткова стройнай і худой фігуры — моцна выступаюць адкладанні мясцовага характару, так званыя рэзістэнтныя зоны. З дапамогай ліпаэкстрацыі магчыма выбраць кілаграмаў пяць.

Што ж датычыць Пугачовай — спецыялісты па ліпаскульптуры з СНД называюць такія выпадкі "казуістычнымі". Бо поўнасцю абястлусціць тоўстага чалавека нельга — у якую частку цела зонд не ўвядзі, тлушч можна выбіраць бясконца. Праўда, на Захадзе падобныя аперацыі робяць, але паступова. І толькі мульцімільянерам, бо каштуюць яны вельмі і вельмі дорага.

ГАДЗІННІКІ–РЭКАРДСМЕНЫ

"Цікава, якіх тавараў народнага спажывання рэспубліка выпускае больш за ўсё?

А.МЕЛЬНІКАЎ, г.Барысаў".

Аказваецца, усе рэкорды пабіла вытворчасць бытавых гадзіннікаў. За шэсць месяцаў гэтага года іх сышло з канвеера 8.733 тысячы штук. Услед за лідэрамі ідуць школьныя сшыткі. Іх адпраўлена ў гандаль 7.410 тысяч штук. Не спыняюцца і ткацкія станкі на прадпрыемствах, якія выпускаюць дываны. Велізарны "дыван" памерам 5.608 тысяч квадратных метраў стварылі беларускія майстры. Дастаткова многа гумавага абутку выпускае Беларусь. За паўгода тут зроблена столькі непрамакальных ботаў, тапак, галёшаў, што ў іх можна абуць 1850 тысяч чалавек. Ну, а што ж з бытавой тэхнікай? Як сведчыць статыстыка, было выраблена 299, 1 тысячы штук каляровых тэлевізараў, 421,7 — халадзільнікаў і маразільнікаў, 126,5 электрасокавыціскалак, 42,8 пральных машын і 41,8 тысячы магнітафонаў.

Рубрыку вядзе Святлана КУЛІКОВА, тэл. 68-29-26.



АПОШНІЯ ГАСТРОЛІ?

Барбара Стрэйзенд дала клятву не ўдзельнічаць больш у гастрольных турнэ пасля таго, як апошнія канцэрты абышліся ёй у 75 млн. даляраў.

Стрэйзенд, якой споўнілася 52 гады, пасля 27 гадоў напружанай барацьбы на сцэне адчула сябе эмацыянальна і фізічна стомленай. Пасля заканчэння сусветнага турнэ, якое не прынесла ёй даход, Стрэйзенд заявіла, што яно было апошнім.

ДАБРАЧЫННАЕ ШОУ

Акцёр Пол Н'юман, якому быў прысуджаны Оскар, разам з актрысай Мелані Грыфіт ажыццявіў пастаноўку спектакля "Беласнежка і сем гномаў".

Н'юман сыграў ролю гнома Снізі, а Мелані Грыфіт — злосную каралеву. Шоу было арганізавана для перадачы сродкаў аздараўленчым лагерам для дзяцей, хворых на рак. Ад спектакля артысты выручылі 750 тысяч даляраў.

У МАСТАЦТВА ЎМЯШАЛАСЯ ПАЛІТЫКА

Акцёр Роберт Рэдфард не будзе здымацца, як меркавалася раней, у новым фільме "Прэзідэнт Амерыкі" з–за рознагалоссяў з рэжысёрам Робам Райнерам.

Блізкія сябры акцёра сцвярджаюць, што Рэдфард і Райнер не дасягнулі згоды ў пытаннях, звязаных з "палітычным аспектам фільма".

НОВЫ ПРАЕКТ СПАЙКА ЛІ

Чарнаскуры амерыканскі прадзюсер Спайк Лі збіраецца зняць фільм пра бейсбаліста Джэка Робіна, які быў першым чарнаскурым іграком у галоўнай амерыканскай бейсбольнай лізе. Вядомаму акцёру Дэнзелу Вашынгтону было прапанавана зняцца ў галоўнай ролі.

ЛЕ БОН ВЫЙГРАЎ ІСК

Вакаліст групы "Дзюран Дзюран" Сімон Ле Бон падаў у суд на дзве брытанскія газеты, якія прыпісвалі яму інтрыжку, і — выйграў справу.

Газеты апублікавалі гісторыю пра быццам бы меўшы месца раман Ле Бона ў Рыме, у той час, як ён быў жанаты і выхоўваў дзвюх дачок. Суд прызнаў, што на спевака ўзвялі паклёп, і "Daily Express", і "Daily Star" давялося прызнаць, што ў аўтараў артыкулаў не было "дастатковых падстаў" для абвінавачвання музыканта.

ГАСТРОЛІ – ПАД ПЫТАННЕМ

"Іглз" давялося адмяніць турнэ па Амерыцы з–за таго, што ў саліста гурта Глена Фрэя абвастрылася хранічнае захворванне.

Фрэй, пакутуючы на хранічнае кішэчнае расстройства, ляжыць у бальніцы, а музыкантам гурта прыйшлося змяніць расклад гастролей. Невядома, ці адбудуцца і запланаваныя раней выступленні "Іглз" у Новай Зеландыі.

НАВУКА І МАСТАЦТВА СУМЯШЧАЛЬНЫЯ?

З роллю наркамана ў новым фільме Травалта зноў вярнуўся на экран.

У 30-я гады акцёр прапанаваў Амерыцы апошні і агульнапрызнаны варыянт "Сна ў летнюю ноч", у 70-я — сур'ёзна захапляўся навукай, якой збіраецца займацца і далей. Зараз акцёр жыве ў Фларыдзе з жонкай-актрысай, выхоўвае трохгадовага сына Джэта.

ТРЫУМФ МАДЭЛЬЕРА

Апошняя калекцыя Версака захапіла ўсіх у самых вытанчаных колах.

Топ-мадэлі і галівудскія зоркі сустрэлі мадэльера з Паўднёвай Італіі пацалункамі, пасля таго як ён прадэманстраваў свае мадэлі. Яны былі прызнаны самымі лепшымі з усіх папярэдніх калекцый. Цяпер самыя вядомыя манекеншчыцы аспрэчваюць права дэманстраваць яго элегантныя касцюмы і цудоўныя вячэрнія сукенкі.

ІНФА-КРЫМ

Забілі маці і сына... з–за барахла

Гэта забойства ўзрушвае сваёй жорсткасцю. Жыхарку вуліцы імя Церашковай у Віцебску, загадчыцу гаспадаркі дзіцячага садка і яе сына–шасцікласніка знайшлі забітымі ў сваёй кватэры. Яны ляжалі на ложку са звязанымі рукамі і нагамі, са слядамі цялесных пашкоджанняў.

З кватэры выкрадзены залатыя вырабы, магнітафон, адзенне.

БЕЛІНФАРМ.

Атрута для жонкі

Западозрыўшы сваю жонку ў здрадзе, жыхар Маладзечна П. аб'явіў ёй смяротны прыгавор. Аднак у жонкі знайшлося супрацьяддзе!

Ведаючы, што муж любіць надта выпіць, яна прапанавала яму бутэльку гарэлкі. Потым паставіла на стол і другую. Разлік "смертніцы" быў беспамылковым: праз нейкі час п'яны "Атэла" заснуў за сталом. Міліцыя, якая прыехала па выкліку, знайшла ў сенцах вяроўку і атруту для... мышэй.

Вядзецца следства.

Мікола КАПЫЛОВІЧ.



Украінскіх, малдаўскіх і, канешне ж, беларускіх слухачоў зачараваў сваім мастацтвам ансамбль "Копыльскія дудары". Спецыяльна для яго пісаў творы кампазітар Іван Кузняцоў, адзін з заснавальнікаў калектыва. Свае творы з задавальненнем перадаюць ансамблю кампазітары лаўрэат Дзяржаўнай прэміі рэспублікі Уладзімір Кур'ян і Віктар Войцік. Інструменты ж для самадзейнага калектыву зрабілі вядомы народны майстра Уладзімір Пузыня і канцэртмайстар ансамбля Аляксандр Еўдакімаў.

Нядаўна "Копыльскія дудары" з поспехам выступілі на творчым вечары, прысвечаным 75–годдзю І.Кузняцова. Зараз жа яны рыхтуюцца да паездкі ў Францыю.

Фота Аляксандра ТАЛОЧКІ.

З НАГОДЫ

Свята кожны дзень

У кастрычніку адбылася не толькі Вялікая рэвалюцыя, але і... Нарадзіліся Міхаіл Лермантаў, Джон Рыд, Луі Жан Люм'ер, Іў Мантан і Армэн Джыгарханян, Папанаў і Еўсцігнееў, былі зняты першы рускі фільм "Сценька Разін і князёўна" і першая расійская поўнаметражная стужка "Абарона Севастопаля". Гэтай парой мы віншуем са святам настаўнікаў і Арганізацыю Аб'яднаных Нацый, беларускую зямлю — асобна — з нараджэннем паэта Алеся Змагара, жывапісца Ізраіля Басава, гісторыка і літаратуразнаўца Вацлава Ластоўскага, кінарэжысёра Ігара Дабралюбава...

Успомнім пра іншыя святы і не юбілейныя ў гэтым годзе дні нараджэння, якія заўжды раней вылучаліся настольнымі календарамі. Тым больш, некаторыя з былых святаў ужо не адзначаюцца, а, гаворачы пра нараджэнне, успамінаюць толькі юбіляраў.

"Адбылося! Чалавечы розум перамог моц прыроды: на арбіце першы штучны спадарожнік Зямлі!!!" Такім воклічам сродкі масавай інфармацыі ўсяго свету скалыхнулі паветра 4 кастрычніка 1957 года.

Пакуль здзіўленыя людзі заварожана слухалі сігналы "біп...біп...біп", пісьменнікі і публіцысты занатоўвалі гэты дзень на паперы для будучых пакаленняў: "...Пачатак кастрычніка. Пара прыгожай залатой восені. Краіна напярэдадні славутага юбілею. Мільёны людзей рыхтуюць працоўныя падарункі. Па традыцыі падводзяцца вынікі, каардынуюцца новыя планы. Настрой прыўзняты, радасны".

Нехта яшчэ памятае, як гучалі апошнія стартавыя каманды, як урачысты і ўсхваляваны голас дыктара Маскоўскага радыё Ю.Левітана паведаміў: "У выніку вялікай напружанай работы навукова-даследчых інстытутаў і канструктарскіх бюро створаны першы ў свеце штучны спадарожнік Зямлі. 4 кастрычніка 1957 года ў СССР паспяхова прайшоў запуск першага спадарожніка. Папярэднія даныя сведчаць пра тое, што ракета-носьбіт перадала спадарожніку неабходную арбітальную хуткасць каля 8000 м/с. У дадзены момант спадарожнік апісвае эліптычныя траекторыі вакол Зямлі, і яго палёт можна назіраць у промнях узыходзячага і заходзячага Сонца..."

Тыя ж, хто не стаў відавочцам падзей 1957 года, ужо гарталі навуковыя выданні па касманаўтыцы. Іх здавальняла звычайная лічбавая інфармацыя: за час свайго існавання — з 4 кастрычніка 1957 г. па 4 снежня 1958 г. — штучны спадарожнік здзейсніў 1400 абаротаў вакол планеты, шляхам даўжынёю 57 мільёнаў кіламетраў. Гэта прыкладна адпавядае адлегласці да Марса ў перыяды вялікіх процістаянняў. Дыяметр спадарожніка не перавышаў 58 см, маса — 83,6 кг. Звонку былі шарнірна ўмацаваны антэны — 4 стрыжні даўжынёй ад 2,4 да 2,9 метра.

Так, залатой парой 1957 года (не выпадкова, канешне, да 40-й гадавіны кастрычніцкай рэвалюцыі) Савецкі Саюз увайшоў у касмічную эру.

Праз плённую працу і радаснае ўспрыманне навізны прыйшоў у свой час да мільёнаў людзей і кінематограф...

5 кастрычніка 1864 года ў Безансоне нарадзіўся Луі Жан Люм'ер. Беларуская савецкая энцыклапедыя піша, што ён — вынаходнік кінематографа, пііянер французскай кінавытворчасці і кінарэжысуры.

Сапраўды, разам з братам Агюстам (які, дарэчы, нарадзіўся 20 кастрычніка 1862 г.) ён зрабіў апарат, які дазволіў не толькі перадаваць рухі вобразатвораў на плоскасць, але і здзейсніць пры яго дапамозе здымку фільма.

Канструктыўная годнасць апарата тлумачыцца тым, што браты з маленства займаліся фотасправай. Іх бацька, Антуан Люм'ер, меў у Ліёне сваю фабрыку фотаматэрыялаў. Да таго ж, браты былі хімікамі па адукацыі, сустракаліся з навукоўцамі, якія займаліся хронафатаграфіяй.

28 студзеня 1895 года ў Парыжы, у памяшканні "Гранд Кафэ" на бульвары Капуцынаў, адбылася першая прылюдная дэманстрацыя фільмаў братоў Люм'ер. Гэты дзень лічаць цяпер днём нараджэння кінематографа.

Запуск першага штучнага спадарожніка і першай кінастужкі — падзеі сусветна вядомыя і святочныя для людзей усіх краін. А вось 7 кастрычніка — асабістае свята Савецкага Саюза, Дзень Канстытуцыі СССР. Яго знікненне з разраду святочных нагадвае гісторыю пра першага савецкага прэзідэнта. Магчыма, таму, што ўсе яны — Савецкі Саюз, яго апошні прэзідэнт і Канстытуцыя СССР — адначасова выйшлі з актыўнага палітычнага жыцця. І прэзідэнты памыляюцца: "Адным з найвялікшых заваяванняў Кастрычніка з'яўляецца сяброўства савецкіх народаў. Яно само па сабе — унікальная з'ява ў сусветнай гісторыі. Для нас жа — адзін з галоўных гарантаў магутнасці і трываласці Савецкай дзяржавы". А бывае, і Канстытуцыя не навечна гарантуе: "Грамадзяне СССР роўныя перад Законам незалежна ад паходжання, сацыяльнага і маёмаснага становішча, расавай і нацыянальнай прыналежнасці, полу, адукацыі, мовы, стаўлення да рэлігіі..."

"Трываласць Савецкай дзяржавы", "грамадзяне СССР" дажываюць цяпер у гісторыі, як і тое, пра што 75 гадоў назад, 10 кастрычніка, пісаў У.І.Ленін у артыкуле "Прывітанне італьянскім, французскім і нямецкім камуністам":"...Трэці Інтэрнацыянал атрымаў шэраг бліскучых, нябывалых перамог за некалькі месяцаў. Хуткасць яго росту здзіўляе. Уласныя памылкі і хваробы росту не перашкаджаюць. Перамога камунізму непазбежна. Перамога будзе за ім".

Часам здараецца так: чым даўжэй жыве на паперы слова, тым бліжэй яно па сваёй сутнасці і значэнню да нейкага міфа. Між тым, чалавека, які "стварыў сваё імя" словам, вызначаюць як таленавітага толькі з цягам часу.

У 1897 годзе, 15 кастрычніка, нарадзілася „першая палавіна" аўтара "Дванаццаці крэслаў" Ілья Ільф. (Дарэчы, другая палова"— Яўген Пятроў" — нарадзіўся ў 1903 годзе). Абедзве "часткі" — у Адэсе.

Ільф (Ілья Арнольдавіч Файнзільберг) да таго часу, як пераехаў у Маскву, дзе толькі не працаваў... У чарцёжным бюро, на тэлефоннай станцыі, на авіяцыйным заводзе і на фабрыцы ручных гранат. Пасля гэтага быў статыстам, рэдактарам гумарыстычнага часопіса "Сіндэтыкон", дзе пісаў вершы пад жаночым псеўданімам, бухгалтарам і членам прэзідыума Адэскага згуртавання паэтаў.

У Маскве Ільф стаў журналістам — рыхтаваў матэрыялы для чацвёртай старонкі газеты "Гудок". Тут жа працавалі Пятроў (Яўген Катаеў) і яго старэйшы брат Валянцін, які пісаў фельетоны пад псеўданімам "Стары Сабакін". Апошні ўвайшоў аднойчы ў пакой чацвёртай паласы са словамі: "Я хачу стаць савецкім Дзюма-бацькам". Ільф адразу запытаў: "Чаму гэта, Валюн, вы раптам захацелі стаць Дзюма-пяром?" Стары Сабакін адказаў, што прыйшоў час адчыняць майстэрню савецкага рамана "Я вам буду даваць тэмы, вы будзеце пісаць раманы, а я іх потым буду выпраўляць..." І адразу прапанаваў тэму, "Уявіце сабе: у адным з крэслаў схаваны грошы. Іх трэба знайсці. Чым не авантурны раман?"

Тэма спадабалася. І па прапанове Ільфа ён і Пятроў пачалі пісаць...

Мінулі гады сумеснай працы і сяброўства, калі аднойчы адзін з іх заўважыў: хораша было б загінуць разам у час якой-небудзь катастрофы. "Цяжка ўявіць, што прыйдзе такі момант, калі нехта з нас застанецца адзін на адзін з пішучай машынкай. У пакоі будзе ціха, пуста і трэба будзе пісаць".

Вясной 1937 года хавалі Ільфа. Пятроў сумна вымавіў: "Я прысутнічаю на ўласным пахаванні..."

Шмат талентаў пахавала зямля ў розныя гады, стагоддзі і ў розных краінах. Многіх з ліку Вялікіх аб'ядноўвае толькі адзіная рэч — восеньская пара нараджэння, кастрычнік.

...Літоўскі паэт Эдуардас Межэлайціс, англійскі жывапісец Уільям Хогарт, народны артыст СССР М.Жараў, савецкі паэт А.Суркоў, французскі пісьменнік Луі Арагон, беларускі графік, скульптар і жывапісец Язэп Драздовіч...

А быў час, з нараджэннем віншавалі не толькі людзей, але і арганізацыі: 19 мая — Усесаюзную піянерскую арганізацыю імя У.І.Леніна, а 29 кастрычніка — камсамол.

Такое асаблівае стаўленне да маладзёжных арганізацый, выдзяленне іх сярод іншых "з правам нараджацца кожны год" можна было адзначыць толькі станоўча: "Будучыня ў многім залежыць ад таго, якую моладзь мы выхоўваем сёння. Гэта задача ўсёй партыі, усяго народа. Гэта самая выжная, карэнная задача Ленінскага камсамола" (з Палітычнага даклада ЦК КПСС, XXVII з'езда КПСС, М.С.Гарбачова).

І кожны дзень — свята. Яно бывае ўрачыстым альбо чаканым. Раней "урачыстае" абазначала "чырвона-параднае". Урачыстасці ў кастрычніку... Напрыклад, Вялікая рэвалюцыя, Дзень Канстытуцыі СССР, нараджэнне камсамола. А ўсе астатнія дні — будзённыя. Няма ў іх ні параднага колеру, ні ўрачыстых пачуццяў. Гэта — проста восень. Чаканая пасля зялёнага, гарачага лета. Гэта проста восеньскія дні, калі шамаціць апалае долу бардова-жоўтае лісце, калі збіваюць каштаны... Такое свята і не старэе.

Святлана БАРЫСЕНКА.



КРЫМІНАЛЬНАЕ БЮРО

ЭХ.., РАЗ, ЯШЧЭ РАЗ...

З-за таго, што не хацеў паважаць Крымінальны кодэкс, садзіўся ён на лаву падсудных...

У свае трыццаць два гады мець шэсць судзімасцей — гэта ўжо штосьці з галіны рэкордаў. Сумных, канешне. Таму што праводзіць самую лепшую, што ні кажыце, пару жыцця ў месцах не такіх аддаленых—быць пазбаўленым волі— такое не пажадаеш нават свайму ворагу. А Ігар, як яго характарызуюць тыя, хто яго ведае, з кім ён вучыўся ці працаваў потым, зусім звычайны малады чалавек, які не цураецца любой працы, даволі кампетэнтны хлопец, спакойнага нораву, паважлівы і добрасумленны. З адной толькі агаворкай... Да таго часу, пакуль цвярозы.

Затое варта яму толькі пакаштаваць гэтага "зялёнага змея", як Ігар тут жа мяняецца прама на вачах, пачынае такое вырабляць, адным словам страчвае над сабой усякі кантроль. Вынік, як вы разумееце, заўсёды аднолькава сумны.

Так было і на гэты раз. Пасля адбыцця пакарання нашага адмоўнага героя прынялі ў калгас на працу. Работа, шчыра кажучы, не бі ляжачага, з ліку тых, пра якія дасведчаныя людзі вобразна кажуць, жывот не надарвеш. Вядомая справа: пастух ёсць пастух. Гуляй сабе па траве-мураве, глядзі каб кароўкі былі цэлыя ды накормленыя ўдосталь, малачка давалі пабольш, бо ад гэтага залежыць твой канчатковы заробак і, зразумела, павага з боку калгаснікаў-аднавяскоцаў.

Чаго, здавалася б, больш трэба? Дык не, зноў жа за старое ўзяўся. Нястрымна захацелася "лыч напаіць". І зразумела, фінал вядомы: "зладзейка з наклейкай" і на гэты раз да дабра не давяла.

Як усё адбылося. А вельмі проста, банальна, калі хочаце. Каб знайсці гэтую самую запаветную бутэльку, ён ні да чаго іншага не дадумаўся, як залезці ў калгасны свіран, што знаходзіцца на краю вёскі, і выкрасці адтуль фуражнай мукі на продаж ці яшчэ лепш — на бартэрны, як цяпер людзі называюць, абмен. Па вядомай формуле: "Я табе гэта, а ты мне — тое". Што маецца на ўвазе канкрэтна, зразумела кожнаму.

Так і зрабіў. Падкраўся ў начны час да памяшкання з адваротнага боку, сарваў аконную раму, пранікнуў ва ўнутр склада, насыпаў пару мяшкоў мукі і па чарзе аднёс іх у бліжэйшую хату, прапанаваўшы выгадную здзелку гаспадарам-пенсіянерам.

Як ні дзіўна, тыя не насцярожыліся, не пацікавіліся нават, адкуль, маўляў, дабро такое і чыё яно на самай справе, а спакойна "атаварылі" тым, чаго прасіў "купец-карабейнік".

Што было раніцай, вы, зразумела, ужо здагадаліся і самі. Злачынства раскрылася па свежых слядах і рэчавых доказах. Ды і ўсе дзеючыя асобы гэтай непрыгожай гісторыі не адпіраліся: не было сэнсу, настолькі ўсё было відавочна. Напэўна часта потым успамінаўся з горыччу слабавольнаму Ігару развітальны найгрыш калгаснага гарманіста:

"Эх, раз, яшчэ раз..."

Аляксандр ХАРКЕВІЧ.

ПАСЛЯ ПАДЗЕІ

ГЛЯДЗЕЦЬ У БУДУЧЫНЮ

У маляўнічым прадмесці Варшавы — Падкове Лесней, адбылася міжнародная канферэнцыя "Савецкі Саюз — Польшча 1919—1989 гады", прысвечаная польска-савецкім адносінам у так званы сацыялістычны перыяд суседства. У ёй прымалі ўдзел прадстаўнікі Расіі, Польшчы, Чэхіі, Украіны, Францыі, Германіі, Літвы і Казахстана, у якасці назіральнікаў у канферэнцыі ўдзельнічалі і беларускія вучоныя. Пра тое, якія пытанні разглядаліся ў Варшаве, чаму канферэнцыя выклікала цікавасць у беларускіх гісторыкаў, расказвае загадчык аддзела ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі Аляксей Ліцвін, які ўдзельнічаў у гэтым форуме.

— Гэта ўжо не першая канферэнцыя. Яна з'явілася чарговым этапам міжнароднай праграмы "Агульны лёс — усходняя Еўропа", якая ажыццяўляецца цэнтрам "Карта" і таварыствамі "Мемарыял" у Польшчы, Расіі і на Украіне. Цікавасць да яе ў беларускіх вучоных была выклікана не толькі тэмай, але і складам удзельнікаў. Перш за ўсё супрацоўнікаў расійскіх архіваў. Нягледзячы на сённяшнюю свабоду, расійскія архівы сталі амаль недаступнымі па эканамічных прычынах. Так што мы мелі магчымасць пачуць інфармацыю, якая, па сутнасці, пакуль для нас недаступная.

БЕЛІНФАРМ.

СТРАКАТАЯ МАЗАІКА

АЛЬГЕРД ВЯЛІКІ ЗАЎСЁДЫ БЫЎ ЦВЯРОЗЫМ

Святоній у сваіх допісах адзначыў такую якасць у вялікага палкаводца, грамадскага дзеяча і пісьменніка Гая Юлія Цэзара: "Віна ён піў вельмі мала: гэтага не адмаўляюць нават яго ворагі". Марку Катону належаць словы: "Цэзар адзін з усіх бярэцца за дзяржаўны пераварот цвярозым". Але, як аказваецца, якасцей у нашага Альгерда Вялікага было болей — ён зусім не піў алкагольных напояў. Вось што занатаваў адзін з летапісцаў: "...ён не піў ні віна, ні піва, меў вялікі розум і падначаліў шмат зямель, патаемна рыхтаваў свае паходы, ваюючы не столькі колькасцю, колькі ўмельствам". Цікава, што потым рускія вучоныя і даследчыкі ўвялі тэрмін: "ваяваць не колькасцю, а ўмельствам" у сувораўскую "Навуку перамагаць...".

ЧАГО НЯМА Ў БАРАНАВІЧАХ?

Колькасць жыхароў у горадзе чыгуначнікаў дасягае прыблізна 200 тысяч чалавек. Гэта восьмы населены пункт у Беларусі. Да прыкладу возьмем старажытны горад Пергам (сучасны Бергам), у якім налічвалася 120 тысяч жыхароў. Ён меў самы буйны ў свеце амфітэатр (46 метраў у вышыню, 80 каменных падкоў — пасадачных радоў) і быў разлічаны на 15 тысяч гледачоў. З паўночна-ўсходняга боку Пергама знаходзіўся другі тэатр (5 тысяч гледачоў), крышачку далей — яшчэ адзін амфітэатр на 30 тысяч месцаў, а ў некалькіх сотнях метраў збудаваны яшчэ тэатр на 50 тысяч гледачоў. Для якіх мэт у горадзе на 120 тысяч чалавек мелася столькі тэатраў? У адной з частак Пергама — Асклепіі — знаходзіўся славуты медыцынскі цэнтр, а адной з таямніц асклепійскай школы было лячэнне душы — псіхатэрапія. У якасці лекаў — наведванне аднаго з тэатраў.

ГЕЗЕ – 5000 ГОД

Сёння можна смела і гучна сказаць на ўсю Беларусь, што прафесар, доктар геолага-мінералагічных навук, Эрнст Аркадзьевіч Ляўкоў сваёй кнігай "Маўклівыя сведкі мінуўшчыны" ўпісаў у гісторыю беларускага друку адну з самых яркіх і адметных старонак. У 1995 годзе гэта кніга будзе перавыдадзена, бо з дня выхаду ў свет стала незвычайнай каштоўнасцю па гісторыі і будучыні беларускіх камянёў і бібліяграфічнай рэдкасцю.

Аднак знакаміты вучоны Э.Ляўкоў вядомы не толькі адкрыццямі і ведамі ў геалогіі і мінералогіі, але і даследаваннямі слова "гега". Пачуўшы яго аднойчы, ён зрабіў яго гістарычна-моўную рэканструкцыю. Аказалася, што беларускаму слову "гега" — 5 тысяч год, і яно абазначае "крэмень". Ад "гегі" — вядома нямецкае "hegen" — аберагаць, жамойцкае "Jega" — моц. І яшчэ, вядома інтэрнацыянальнае слова "гегемон" — правадыр, кіраўнік. Вядомы таксама беларускія словы "нягега", "нягеглы"...

Крэмень — гега — ў старажытнасці каштаваў даражэй за золата. Як паказваюць даследаванні, шмат тысячагоддзяў у Беларусі было больш за 10 тысяч гегавых (крэмніевых) шахт.

ЦІ БЫЛІ КАМУНІСТЫ НА БЕЛАРУСІ Ў XVII СТАГОДДЗІ?

Так, яны былі. Нават вядома месца іх знаходжання. У гэтых мэтах я прывяду толькі адзін факт. У адным з прыгажэйшых гарадоў Беларусі — Пінску стаіць велічны культавы гмах, які мае назву Карла Барамея, гэты касцёл узведзены на астанках іншага ў 1770—82 гадах з цэглы.

А цяпер перакінемся ў XVII стагоддзе. У 1695 годзе на тым жа самым месцы завершана будаўніцтва драўлянага касцёла (спецыяльны заказ. — М.М.) для манахаў ордэна камуністаў, якія гуртам прыбылі ў прадмесце Пінска Каралін (сёння ў межах горада) з Паўночнай Італіі.

Так што камуністычны рух на Беларусі існуе здаўна, толькі раней запісваліся ў ордэны, а сёння ў... партыі.

БЫЛО СЯЛО САРСКІМ, А СТАЛА ЦАРСКІМ...

Двойчы быў у Царскім Сяле, што пад Санкт-Пецярбургам, і заўсёды дзівіўся і ўражваўся тамтэйшымі цудамі — палацамі, паркам, творамі мастацтва... І не ведаў, што калісьці ў яго была іншая назва. Аднаго разу сустрэўся з найменнем Сарскае Сяло і тады адразу ж напісаў ліст былой блакадніцы Ленінграда Марыі Пятроўне Быстровай. У адказе яна паведамляла, што будаўніцтва Екацярынінскага палаца пачалося ў 1718 годзе на Саарскай мызе і спачатку населены пункт меў назву Саарскае Сяло, потым Сарскае, з цягам часу, там жылі і адпачывалі расейскія цары, яно атрымала назву Царскага Сяла...

МІНЫ, ЯКІЯ НЕ ЎЗРЫВАЮЦЦА

Вядома, што міна — гэта баявы сродак для наладжвання ўзрыўных загарод; гэта род артылерыйскага снарада вялікай магутнасці. Але ёсць яшчэ такія міны, якія ніколі не ўзрываюцца: выраз твару (рабіць вясёлую міну пры дрэннай гульні); мера вагі (ад 440 да 600 г); грашовая адзінка ў Старажытнай Грэцыі; стрыжань алоўка.

ПЕРШЫ Ў СВЕЦЕ МУЗЕЙ ВАСКОВЫХ ФІГУР

Так-так, ён быў створаны не ў Англіі славутай мадам Цюсо, а ў "другой сталіцы" Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Як гэта адбылося? На зыходзе XVII і ў пачатку XVII стагоддзяў хеўра разбойнікаў пакваплілася на самыя славутыя каштоўнасці ўжо спаланізаваных Радзівілаў — 12 апосталаў з золата, срэбра і дзівосных камянёў. Хітрыя і дальнабачныя Радзівілы ўсё прадугледзелі — яны зрабілі копіі з воску гэтых апосталаў і разам з васковымі фігурамі з адбіткаў забітых разбойнікаў выставілі іх у Блакітнай зале палаца ў Нясвіжы.

Дзе арыгіналы гэтых апосталаў і іх копіі — сёння нікому невядома. Час знікнення іх абазначаны Айчыннай вайной 1812 года...

ШТО ПІЛІ–ЕЛІ НАШЫ САНАВІТЫЯ ПРОДКІ?

У некалі славутым Дзярэчыне (мястэчка ў Зэльвенскім раёне) у ваяводы Сапегі "Віно кіпрскае, італьянскае і гішпанскае разносілі ў такой колькасці графінаў, колькі дзён мае год, а кварт мёду выпівалі столькі, колькі год мае гадзін (8760!)...".

Іншая мясціна, іншыя продкі: "На замку ў Ланцуце брат Канстанцін Любамірскі з Феліцыянам Патоцкім былі на Вялікдзень у гасцях. З'елі яны 60 валоў, 300 цялят, 50 бараноў, 150 свіней і парсюкоў, 21 тысячу курэй, 12740 рыб, 10 порцый ракаў, 4 кіпы перцу ды выпілі 270 бочак піва...".

І КАРАЛЁЎ ПРЫНОСІЛІ Ў АХВЯРУ

Няшчасці, голад, холад, гарачыня — былі неад'емнай і састаўной часткай жыцця амаль усяго насельніцтва зямлі. Так здарылася, што ў часы панавання ў Швецыі караля Дамаледзі быў страшэнны няўрод, а за ім прыйшоў жудасны голад.

Спачатку людзі па дапамогу звярнуліся да свайго Бога Одзіна, прынеслі яму ў ахвяру самых прыгожых і моцных быкоў. Дарэмная справа, Одзін нічога не зрабіў.

Тады шведы рашылі ахвяраваць Одзіну свайго ўладыку Дамаледзі, караля забілі, спусцілі з яго ўсю кроў і ёю абмазалі ўсе сцены ў малітвеным доме.

Міхась МАЛІНОЎСКІ, правадзейны член Геаграфічнага таварыства, г.Баранавічы.

ПЕРАПІСКА

Давайце пазнаёмімся

"Мне 30/180/70. Па характару добры, спагадлівы. Алкаголем не злоўжываю, але куру. Разведзены, [illegible]. Жадаю пазнаёміцца для сумеснага жыцця з мілай, прывабнай жанчынай 25—40 гадоў, добрай гаспадыняй, [illegible] кахання.

Пісаць на адрас: 247414, Гомельская вобл., Светлагорскі раён, в.Здудзічы, вул.Савецкая, д.34. Дразду Рыгору".

"Пазнаёмлюся для стварэння сям'і з добрым, верным, спагадлівым мужчынам, без шкодных звычак, [illegible].

Пра сябе: 30/170, валасы русыя, вочы блакітныя, характар ураўнаважаны.

Пісаць на адрас: 222120, г.Барысаў-4, п/я ХШ-ВН 68/1597".

"Мне 25/175/79, беларус, жыву з бацькамі, люблю дзяцей і хачу стварыць добрую сям'ю з дзяўчынай 18—30 гадоў, якая згодна на пераезд. Адгукніся, мне сэрца падказвае, што ты дзе-небудзь побач. Дзеці не перашкода. Пажадана фота, якое абяцаю вярнуць.

Пісаць на адрас: 247170, Гомельская вобл., г/п Карма, вул.Ільюшчанка, 39/58. Каротка-му Вячаславу".

"Дзве сімпатычныя дзяўчыны пазнаёмяцца з хлопцамі 16—20 гадоў і дзяўчатамі 15—18 гадоў.

Пра сябе: Ксюша, 16/172, па гараскопу Казярог, валасы доўгія светла-русыя, вочы карыя, люблю слухаць музыку і мару стаць фотамадэллю.

Наталі, 16/168, па гараскопу таксама Казярог, вочы блакітныя, валасы русыя, люблю чытаць кнігі і фатаграфавацца.

Пісаць на адрас: 211943, Віцебская вобл., Міёрскі раён, п/а 1 в.Узмёны, вул.Сонечная, д.10. Талкачовай Аксане.

211943, Віцебская вобл., Міёрскі раён, п/а 1 в.Узмёны, вул.Кірава, д.10. Лецкай Наталі".

"Два маладых хлопца жадаюць пазнаёміцца з дзяўчатамі 17—23 гадоў.

Пра сябе: Віталь 21/168/67, па гараскопу Рак. Сяргей, 22/170/70, па гараскопу Скарпіён.

Пісаць на адрас: 222218, Мінская вобл., Смалявіцкі раён, г/п Зялёны Бор, вул.Чыгуначная, д.14, кв.5. Віталю".

"Малады хлопец, 20/185, адзінокі, без шкодных звычак, жадае пазнаёміцца з дзяўчынай 20—30 гадоў, таксама адзінокай, якая не знайшла яшчэ свайго кахання.

Пра сябе: [illegible]. Адкажу на ўсе лісты.

Пісаць на адрас: 225800, Брэсцкая вобл., г.Іванава, вул.50 год Кастрычніка, д.136, кв.44. Літвінчуку Сяргею".

Шукаю сяброў

"Хачу знайсці добрых і надзейных сяброў, якія б маглі зразумець мяне ў цяжкую хвіліну, [illegible].

Пра сябе: 17/173, стройная, валасы русыя, вочы вялікія зялёныя. Жыву ў г.Маладзечна, [illegible] час слухаю сучасную музыку, люблю гатаваць.

На лісты з фота адкажу абавязкова.

Пісаць на адрас: 222431, Мінская вобл., Вілейскі раён, г/п Ілья, інт.№ 1, п.55. Грэцкай Наталлі".

ВЫСТАВЫ

Аматары кошак з цікавасцю азнаёміліся з рэспубліканскай выставай, якая праходзіла ў віцебскім Палацы культуры прафсаюзаў. На ёй былі прадстаўлены каля 80 самых разнастайных парод гэтых жывёл. Эксперты міжнароднага класа па праву ацанілі якасці прыгажуноў, іх пароду і радаслоўную.

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛІНФАРМ.

ЦЁМНЫ БОК МЕСЯЦА

Шабас

(Працяг. Пачатак у ЦБМ ад 4.10)

...Месяц схаваўся за хмары. Пры святле [illegible] зялёных паходняў, з полымем яркім і блакітным, як маланка, на беласнежным [illegible] поўзалі, бегалі, перапляталіся і разыходзіліся вялізныя, чорныя, як вугаль, цені. Гэта скакалі ведзьмы.

— Гар! Гар! Шабас, шабас! Справа-налева, справа-налева!

Абапал Начнога Казла, Hyrcus Nocturnus, што сядзеў на скале, [illegible] — без канца, без пачатку.

— Гар! Гар! Усслаўляйце Начнога Казла! El Boch de Biterne! El Boch de Biterne! [illegible] Радуйцеся!

[illegible]

Ва ўтульных схованках заводзіліся любоўныя шашні [illegible] безабліччнага, шэрага, шурпатага інкуба (дэмана, які спакушае жанчын — ЦБМ) з бессаромна [illegible] манахіняй. Усюды кішэлі агідныя пары.

* * *

Беласнежная, тлустая ведзьма-велізанка [illegible] малако.

Трох[illegible] не бра[illegible] пасвілі [illegible] бугрыс[illegible] апрану[illegible] кардынальскага [illegible] адкорм[illegible].

— [illegible] нецярпліва [illegible] цётка Сідонія.

...І а[illegible] якія з[illegible] завірух[illegible] віскам[illegible].

— Гар! Гар! Справа-налева! Справа-налева!

Чыесьці [illegible] быццам [illegible] вусы ззаду калолі шыю Касандры; нечы тонкі, цвёрды хвост казытаў яе спераду; нехта ўшчыпнуў балюча і бессаромна, нехта ўкусіў, прашаптаў ёй на вуха дзікую ласку. Але яна не пярэчыла: чым горш — тым лепей, чым больш жаху — тым больш асалоды.

Рантам усе імгненна спыніліся, як укапаныя, [illegible] замерлі.

З боку чорнага прастола, дзе сядзеў Невядомы, якога [illegible], пачуўся глухі голас, падобны да гулу землятрусу:

— Прыміце дары мае: [illegible] маю, [illegible] мой, [illegible] беды мае, [illegible] — радасць маю. Прыміце!

Самавіты сівабароды стары, [illegible] членаў [illegible] Інквізіцыі, [illegible] ведзьмароў, які [illegible] урачыста [illegible]:

— [illegible] імя тваё ва [illegible] нас ад [illegible] Пакланіцеся, [illegible]!

Усе ўпалі ніц, і, імітуючы [illegible] грымнуў [illegible]:

— [illegible] — бацьку [illegible] стварыў неба і [illegible] Вельзевула!

Калі [illegible] змоўклі і [illegible] пачуўся той жа [illegible] падобны да гулу [illegible]:

— [illegible] да мяне [illegible] нявесту [illegible]!

[illegible]

— [illegible] тваёй, [illegible]?

— [illegible]! Мадона [illegible] прагудзела ў адказ. [illegible] адчула, як [illegible] валасы [illegible].

— [illegible]! Мадона [illegible] пранеслася над [illegible]. — Дзе яна? Дзе [illegible] Cassandra!

[illegible] рукамі, [illegible] касцяныя [illegible] шчупальцы, [illegible] павуковыя [illegible] схапілі яе, [illegible] голую, [illegible] да [illegible].

[illegible] і холадам [illegible] твар. Яна [illegible] бачыць.

[illegible] сядзеў на [illegible]:

— Прыйдзі!

[illegible] галаву [illegible] ног сваіх [illegible] зіхацеў у [illegible].

[illegible] апошняе [illegible] агіду, [illegible] вочы свае [illegible] ёю.

І цуд адбыўся

Казлінная скура звалілася з яго, [illegible] старажытны алімпійскі бог Дыяніс з'явіўся перад монай Касандрай, з усмешкай вечнай весялосці на вуснах, з паднятым цірсам у адной руцэ, з вінаграднай галінкай у другой; пантэра скакала, імкнулася лізнуць гэтую галінку языком...

* * *

Пачуўся ранішні крык пеўня. Патхнула туманам і едкаю, дымнаю сырасцю. Аднекуль, з бясконцай далечыні, данёсся царкоўны звон. Ад гэтага гуку на гары адбыўся вялікі перапалох.

— Дамоў! Дамоў! Бяжыце, ратуйцеся!

— Чапялу маю ўкралі! — з адчаем лямантаваў таўстабрухі канонік Сілен і мітусіўся, як угарэлы.

— Парсюк, парсюк, ка мне! — клікала рыжая голая, курчылася ад ранішняй сырасці, кашляла.

Месяц ужо заходзіў, выплыў з-за хмар, і ў яго барвовым водбліску перапалоханыя ведзьмы ўзвіваліся рой за роем, як чорныя мухі, разляталіся з Маловай Гары.

— Гар! Гар! Знізу-ўверх, не чапляючы! Ратуйцеся, бяжыце!

Начны Казёл жаласна забляяў і праваліўся скрозь зямлю, а вакол распаўсюдзіўся смурод удушлівай серы.

Гудзелі царкоўныя званы.

* * *

...Вось такім "убачыў" сярэдневяковы шабас пісьменнік Дз.Мяражкоўскі ў сваёй трылогіі "Хрыстос і Антыхрыст". Ці не праўда, на дзіва цікава і па-мастацку пераканаўча?

Кунсткамера ЦБМ

Апошняй "афіцыйна прызнанай" ведзьмай была нейкая Ганна Марыя Швегелін з Лахена. Яе спалілі на кастры ў адным з баварскіх абацтваў у самым канцы XVIII стагоддзя. Але было б найвялікшай памылкай лічыць, што на гэтым розная роду судовыя справы аб вядзьмарстве скончыліся. Праўда, пачынаючы з XIX стагоддзя, ведзьмы на працэсах ужо выступалі хутчэй у ролі пацярпеўшых.

У чэрвені 1962 года суд горада Бамберга (таксама германскі горад, які, дарэчы, у свой час досыць праславіўся інквізітарскімі экзекуцыямі) прыгаварыў да трох гадоў турмы Іагана Георга Фогеля. Той спаліў дом шасцідзесяціпяцігадовай Элізабет Хан, якую многія ў акрузе лічылі ведзьмай. У агні (як бы ў водбліску даўнейшай Інквізіцыі) згарэла ўся маёмасць беднай жанчыны, у тым ліку дзве сабакі і тры курыцы. Сама фрау Хан атрымала апёкі.

"Гэта старая — ведзьма, — урачыста заявіў злачынца перад судом. — Нездарма яе цураюцца людзі. Жыве адна, вечна нешта мармыча, трасе галавой і — падумаць толькі — размаўляе са сваімі сабакамі! Я не чапляў бы яе, калі б яна не паслала на мяне жудасны галаўны боль і не пазбавіла апетыту... Чаму я такі ўпэўнены, што ва ўсім вінавата менавіта яна? Вы самі зірніце: хто ж яшчэ? Толькі ведзьма нацягне на сябе такую паскудную спадніцу! А панчохі?! Ведзьма і ёсць..."

Цікава, што вяскоўцы падтрымалі цвердалобага Фогеля. Такім чынам, і сёння тым, каго абвінавацілі ці, прынамсі, западозрылі ў вядзьмарстве, не пазайздросціш...

* * *

Наступная асоба, якую ЦБМ змясціла ў сваёй кунсткамеры — Джордж Адамскі. Ніякіх адносін да вядзьмарства ён, праўда, не меў. Але слава яго таксама мае, так бы мовіць, звышнатуральную падаплёку. Справа ў тым, што шаноўны містэр Адамскі неаднойчы бываў... на борце касмічных караблёў прышэльцаў. Але ўсё па парадку.

...Першы кантакт Адамскага з прадстаўнікамі "не нашай" цывілізацыі адбыўся 9 кастрычніка 1946 года. Менавіта ў гэты дзень над яго домам праляцеў "вялізны карабель-матка, падобны да дырыжабля, у суправаджэнні вёрткіх катэраў-разведчыкаў". Менш чым праз год ужо цэлая флатылія лятаючых сродкаў (дакладна — 184 штукі) нанесла Адамскаму візіт ветлівасці. А ў лістападзе 1952 адбылася яго сустрэча з... жыхаром Венеры Артанам. Дарэчы, тады Адамскаму было ўжо за 60.

"Венеранін", па сведчанню нашага героя, быў "гладкаскурым, безбародым, выдатна апранутым (яўна не з нашых краёў — ЦБМ), з белымі, да плеч, валасамі". Размаўлялі прадстаўнікі дзвюх цывілізацый тэлепатычным спосабам, таму магнітафонныя запісы адсутнічалі. Іншапланецянін адкрыў зямляніну Галоўную Ісціну, якая гучала даволі бясхітрасна: "Вам лепей пачаць жыццё па-новаму, прытрымлівацца правілаў, якія сцвердзіў Тварэц Усяго Існага".

Адамскі аб'ездзіў з лекцыямі ўсю Амерыку, шмат выступаў па радыё і тэлебачанні, даў безліч інтэрв'ю, па чутках нават быў на аўдыенцыі ў нідэрландскай каралевы і папы Іаана XXIII!

Сам "выбраннік" быў родам з Польшчы, не атрымаў аніякай адукацыі, хаця любіў прадстаўляцца "пісьменнікам", "лектарам па праблемах НЛА" і нават "прафесарам". Сам жа ён працаваў... кухарам у кафэ.

Але на гэта забыліся, калі Адамскі пачаў выпускаць у свет кнігу за кнігай аб сваіх кантактах з іншапланецянамі. У гэтых творах былі малюнкі і нават фотаздымкі. Праўда, пазней эксперты без асаблівых цяжкасцей ідэнтыфікавалі загадкавыя прадметы на здымках з... запаленай лямпай у аперацыйнай і пыласосам апошняй мадэлі. І ўсё ж слава авантурыста ад НЛА расла. У Каліфорніі быў створаны "Фонд Адамскага", які працягваў сваё існаванне нават пасля таго, як сам Вялікі Падманшчык перад смерцю прызнаўся, што проста дурыў людзям галаву...

Рубрыку склаў і вядзе Вінцук КАВАЛЕНКА.

АЗБУКА ЗДАРОЎЯ

Народная медыцына

У выдавецтве "Беларуская энцыклапедыя" выйшаў папулярны энцыклапедычны даведнік "Здоровье без лекарств". Сёння мы распачынаем даваць сціслыя вытрымкі з гэтага выдання.

Народная медыцына ўзнікла пры першабытнаабшчынным ладзе. Лячэбная дапамога перш за ўсё стала аказвацца пры траўмах, атручэннях, родах, доглядзе за нованароджанымі. Пазней узніклі спецыяльныя прыёмы лячэння захворванняў з выяўленымі прыкметамі (ліхаманка, пашкоджанні скуры і інш.). На Русі, пачынаючы з эпохі ранняга феадалізму, адзначалася своеасаблівая "спецыялізацыя" народных лекараў: вылучаліся "крывапускі", "кастаправы", "вочныя" лекары і г.д. У Беларусі народная медыцына была ў дастаткова шырокім ужытку да пачатку XX стагоддзя. Было вядома і скарыстоўвалася мноства лекавых сродкаў, у тым ліку і прыроднага паходжання. Напрыклад, здавён ад курынай слепаты лячыліся ўжываннем у ежу печані, ад цынгі — цыбулі, часнаку і хрэну, ад малакроўя — морквы і грэчневай кашы; адвары дубовай і лазовай кары скарыстоўваліся пры захворваннях кішэчна-страўнікавага тракту і поласці рота, распаранае льняное семя — для прыпарак, а яго ны алей — як паслабляльны сродак.

Арсенал лекавых сродкаў, што скарыстоўваюцца ў народнай медыцыне, налічвае каля 10 тысяч відаў (галоўным чынам расліннага і жывёльнага паходжання, а таксама мінералаў) і з'яўляецца невычэрпнай крыніцай для сучаснай медыцыны. Сярод народных тэрапеўтычных сродкаў найбольшае распаўсюджанне атрымалі лекі расліннага паходжання, заснаваныя на выкарыстанні дзікарастучых, садовых, агародных раслін, тэхнічных культур. З усяго гэтага багацця гатавалі адвары, настойкі, мазі, парашкі, скарыстоўвалі і сок свежых раслін. Напрыклад, слабыя настоі ці разведзены сок цыбулі і часнаку скарыстоўвалі пры лячэнні жаночых захворванняў, у выглядзе здробненай кашкі іх скарыстоўвалі пры лячэнні язваў, лішаёў, экзем і г.д. Да ранаў прыкладалі свежае лісце медуніцы, падбелу, лопуху, трыпутніка, мацярдушкі, здробнены драўняны вугаль, драўняны попел і г.д. Пры прастудах націраліся гарчыцай, хрэнам, рэдзькай.

Шырока скарыстоўваліся ў лекавых мэтах сродкі жывёльнага паходжання, асабліва тлушчы: барсучы, сабачы, вожыкавы, мядзведжы, заячы, топленае сала, а таксама малочныя прадукты. Топленае масла прызначалася пры ламоце, газавых коліках, як слабіцельнае, для выгнання некаторых гельмінтаў, пры галавакружэнні, галаўным болі, сырадой — пры сухотах і іншых лёгачных захворваннях. Малако скарыстоўвалася таксама пры прастудзе, пякотцы, харчовых атручэннях, кумыс — пры знясіленнях, малакроўі, лёгачных захворваннях, валляку і як заспакаяльны сродак.

Рэчывы мінеральнага паходжання — пясок, гліну, зямлю, тарфяныя гразі — часцяком скарыстоўвалі ў якасці фізіятэрапеўтычных сродкаў. Халоднай глінай абкладвалі суставы пры звіхах, выцятыя месцы; пясочныя ванны дапамагалі пры рэўматычных болях.

Народная медыцына ўсе хірургічныя захворванні лячыла "бяскроўным шляхам". Пры ўнутраным крывацёку (лёгачным, гарлавым, страўнікавым) давалі глытаць кавалачкі лёду, пілі халодную ваду. Для спынення моцных крывацёкаў скарыстоўвалі салявыя растворы, настоі і адвары розных раслін, якія павышалі згортваемасць крыві, выклікалі звужэнне сасудаў.

Адным са старажытнейшых відаў лячэння з'яўляецца скарыстанне п'явак. Апошнія ўжываліся пры галаўным болі, галавакружэнні, шуме ў галаве.

Прывядзём некалькі рэкамендацый і рэцэптаў народнай медыцыны па лячэнню асобных захворванняў ці зняццю хваравітых станаў.

АНГІНА

Для прафілактыкі і лячэння рэкамендуецца:

— штодзённа 5—6 разоў жаваць корань аеру;

— паласкаць горла сокам каланхоэ, разведзеным удвая вадой;

— паласкаць горла сокам сталовых буракоў з дабаўленнем на 1 шклянку соку 1 сталовай лыжкі воцату;

— пры самым пачатку ангіны павольна жаваць цэдру лімона.

БРАНХІТ

— прымаць кожную гадзіну па 2—3 сталовыя лыжкі соку, які ўтвараецца пры змешванні чорнай рэдзькі з мёдам (3 лыжкі на караняплод сярэдняй велічыні);

— націраць 3 разы ў дзень грудзі сумессю нагрэтай рыцыны (2 ст.лыжкі) са шкіпінарам (1 ст.лыжка);

— перад сном піць адвар шалфею на малацэ (стал.лыжка на шклянку малака).

ПАВЫШАНЫ ЦІСК

— пры лёгкіх формах піць сок брусніцаў, скарыстоўваць свежыя ягады блакітнага бружмелю, валяр'янавыя настойкі, адвары, парашкі і экстракты;

— піць 3 разы на дзень па паўшклянкі заваркі суквеццяў лугавой канюшыны (лыжка суквеццяў на шклянку кіпеню);

— на працягу 2 месяцаў 3 разы на дзень прымаць за гадзіну да яды па сталовай лыжцы сумесі мёду, соку чырвоных буракоў, морквы, хрэну (па шклянцы) і лімона (адзін плод сярэдняй велічыні).

ПАНІЖАНЫ ЦІСК

— ужываць 3 разы ў дзень па 20—30 мл матачнага малачка;

— выпіваць па 1/4 шклянкі 3 разы ў дзень мёд, змешаны з кветкавым пылком;

— піць па 1/3 шклянкі перад ядой настой сухацвета (10 г травы на шклянку кіпеню).

ЗУБНЫ БОЛЬ

— закласці ў поласць хворага зуба падсоленую кашку з часнаку і цыбулі;

— патрымаць за шчакой кавалачак праполісу;

— прыкласці да хворага месца паміж шчакой і дзяснай кавалачак несалёнага свінога сала;

— пакласці на хворы зуб тоўчаную гваздзіку.

ГАЛАЎНЫ БОЛЬ

— нацерці лоб і віскі зялёным лістом духмянай герані;

— прыкласці да лба кампрэс з воцату;

— прыняць кантрастную ці гарачую нажную ці ручную ванну;

— прымаць пры болі па паўшклянкі настою сумесі мяты, мацярдушкі і кіпрэю (2 чайныя лыжкі травы на шклянку кіпеню).

БОЛІ Ў НЫРКАХ

— піць чай з лісця "мядзведжых вушак" ці кукурузных рыльцаў і парасткаў вішні ці чарэшні;

— адвар святаянніку па 1/4 шклянкі 3 разы на дзень (сталовая лыжка травы на шклянку кіпеню).

КІНААФІША МІНСКА

Па ўсёй рэспубліцы праводзяцца тэматычныя паказы фільмаў, прысвечаныя 70-годдзю беларускага кіно. Наш глядач, якому надакучыла бясконцая плынь "кіначарнухі", мае хоць якую-небудзь магчымасць выбару. У гэтыя дні паказваюцца такія беларускія мастацкія кінакарціны, як "Першы ўзвод", "Да заўтра", "Палескія рабінзоны", "Паўлінка", "Нашы суседзі", "Людзі на балоце", "Чырвонае лісце", "Праз могілкі", "Чалавек, які браў інтэрв'ю", "Навучыся танцаваць", "Сямейныя абставіны", "Дзесятая доля шляху".

"Холад"

Карціна створана кінематаграфістамі Расіі. Пастаноўка рэжысёра Хусейна Эркенава.

...Халоднай лістападаўскай ноччу 1943 года супрацоўнікі НКУС выконвалі чарговае ўрадавае заданне — выгналі са сваіх дамоў безабаронных жанчын, старых, дзяцей, падлеткаў, пагрузілі іх у таварныя вагоны і адправілі ў трагічную невядомасць. Сярод сагнаных людзей у эшалоне былі ашалелая ад гора маладая жанчына, дзіця якой памерла ад голаду і холаду, падлетак Касым, зверскі збіты салдатамі за спробу ўцячы, юная дзяўчына Зуля...

Гэтая страшэнная акцыя праводзілася ў абстаноўцы сакрэтнасці. Камандаваў ёю вопытны і абыякавы да ўсяго кат-прафесіянал палкоўнік Чырвоны, якому дапамагалі не менш жорсткія крывавыя спадручныя. Аднак, былі і такія, як начальнік эшалона капітан Красноў, які спачатку не падазраваў пра мэту аперацыі, але даведаўшыся, мужна адмовіўся ад выканання бесчалавечнага загаду...

У галоўных ролях заняты Мікалай Яроменка, Тамара Схіртладзе, Аляксандр Чыслоў, Людміла Патапава.

"Пошукавае бюро "Фелікс"

Новую каляровую мастацкую кінастужку з такой назвай прадстаўляе на суд гледачоў Свярдлоўская кінастудыя. Яе паставіў па сцэнарыю Анатоля Аліева рэжысёр Уладзімір Лапцеў.

У купэ хуткага цягніка сустрэліся прыгожая маладая жанчына Ларыса і іншаземец. Завязалася знаёмства, выпілі, і ў выніку няўдачлівы госць нашай краіны застаўся без дыпламата, у якім былі даляры. Доблесная міліцыя імгненна вылічыла злачынцу і наляцела на кватэру Пляшчаева, дзе і сапраўды жыла махлярка. Ларыса паспела ўцячы і, як сапраўдны каскадзёр, павісла на вяроўцы за акном, застаўшыся незаўважанай. Пляшчаева арыштавалі, а Ларыса пачала ўласную справу. Пасля вызвалення Пляшчаеў, жадаючы адпомсціць вераломнай здрадніцы, украў яе любімага сабачку, вельмі парадзістага і дарагога. У абмен на любімца ён патрабаваў... ноч кахання. Ларысе нічога не заставалася, як згадзіцца. Тут і прыйшла ёй у галаву геніяльная ідэя...

У фільме здымаліся Андрэй Сакалоў, Марыя Галубкіна, Ігар Дзмітрыеў, Наталля Крачкоўская, Уладзімір Івашоў, Яўген Ляонаў.

"Чалавек у зялёным кімано"

Сумесная вытворчасць Цэнтра баявога майстэрства і Адэскай кінастудыі. Аўтар сцэнарыя — Мурат Джусойты, рэжысёры — Тамерлан Каргаеў, Барыс Кантэміраў.

У родны горад вяртаецца Таму, які мае чорны пояс па каратэ. Яго мэта — адкрыць уласную школу і пачаць аднаўленне любімага віда спорту. Але ў горадзе ўжо ёсць адна секцыя, кіраўнік якой, Фелікс, не мае афіцыйнага права весці трэніроўкі. Секцыя існуе дзякуючы падтрымцы прэзідэнта клуба — Сядога. Удачны Фелікс прадастаўляе Сядому байцоў для ўстрашэння канкурэнтаў, пагромаў і проста "па заказу". Вядома, не бясплатна.

Прыезд Таму не застаецца без увагі Сядога. Ён прадастаўляе юнаку спартыўную залу, гарантуе падтрымку, але патрабуе поўнай залежнасці. Таму адмаўляецца і спрабуе ўпэўніць былога сябра Фелікса змяніць адносіны да каратэ, не рыхтаваць байцоў для Сядога, якія потым будуць "павышаць" сваё майстэрства ў турмах, выхоўваць не пагромшчыкаў, а моцных духам людзей. Фелікс вагаецца і прапануе вырашыць гэту праблему паядынкам — яго каманда супраць каманды Таму. Той, хто прайграе, павінен будзе прыняць умовы пераможцы...

Запамінальныя вобразы ствараюць у фільме Надар Пліеў, Алег Кантэміраў, Ірына Геркаліева, Георгій Татонаў.

18 кастрычніка

"МАСКВА": "Матылёк" ("Гвендалін")*** — 13.20, 16.40. "Школа задавальненняў"*** — 15.10, 18.30, 20.00, 21.30.

"КАСТРЫЧНІК": "Матылёк" ("Гвендалін")*** — 14.00, 19.00. "Круты палюбоўнік"*** — 16.00, 17.30, 21.00. Муз.-пацяшальная прагр. "Макс-шоу" — 21.30.

"АЎРОРА": "Лепшы з лепшых" (д) — 14.30. "Гардэмарыны-3" — 13.00, 15.00. "Салон Кіці"*** — 17.00, 19.00, 21.00. "Эйр Амерыка" — 12.40, 20.30. "Снеданне з відам на Эльбрус" — 16.30, 18.30.

"БЯРЭСЦЕ": "Жаночая тайна"*** — 12.00, 16.00, 19.30. "Нулявы допуск" — 14.00, 17.40, 21.10. "Снеданне з відам на Эльбрус" — 11.30, 15.10, 21.30. "Тэрмінатар-2" (2 с.)** — 12.50, 16.40, 19.00.

"ВІЛЬНЮС": "Франкенштэйн-2000" (фільм жахаў)*** — 14.00, 17.00, 20.20. "Снеданне з відам на Эльбрус" — 15.40. "Сесілія"**** — 18.40, 22.00 (н). Інф.-пацяшальная прагр. "Усмешка" — 20.30.

"ДРУЖБА": "Уварванне ў тайну"*** — 14.30, 19.00. "Калігула" (2 с.)**** — 16.20, 20.40. Відэабар працуе з 12.00.

"ПАРТЫЗАН": "Матылёк" ("Гвендалін")*** — 14.40, 19.50. "У напрамку сонца" — 13.00, 16.30, 18.10, 21.40.

"ПЕРАМОГА": "Салон Кіці"*** — 14.10, 19.00, 20.50. "Снеданне з відам на Эльбрус" — 12.50, 16.00. "Начныя ястрабы"*** — 11.00, 17.20.

"САЛЮТ": "У напрамку сонца" — 12.00, 15.40, 17.30, 19.20. "Матылёк" ("Гвендалін")*** — 13.50, 21.10.

"СУЧАСНІК": "Чортава карусель" — 14.30. "Эмануэль-6"**** — 16.00, 17.40, 19.20, 21.00.

"БЕЛАРУСЬ": "Легенда пра дыназаўра-2" — 11.00, 14.50, 18.40. "Камандо" (А.Шварцэнегер у гал.ролі)** — 10.30, 16.00. "Моцны арэшак" — 12.10, 17.40. "Уцекачы" — 14.30, 20.00. "Ці кахаеш ты мяне?"*** — 13.00, 20.40. "Разборлівы жаніх" — 16.50.

"КІЕЎ": "Паліцэйская хватка" — 15.00. "Віва, Кастра!" — 16.40. "Эмануэль-5"**** — 18.20, 19.40, 21.00.

"КАМСАМОЛЕЦ": "Паважаны лясун" і інш.мультфільмы (д) — 10.30, 13.00. "Уварванне ў тайну"*** — 12.00, 16.30, 19.00, 20.30. "Тэмпераментныя дактары" — 15.00, 20.40. "Амерыканскі дзядуля" — 14.00, 16.00. Рэтраспектыўны паказ: "Няхай гавораць" (Рафаэль у муз.фільме) — 17.20.

ХАТНІ ЭКРАН

■ 18, аўторак

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Дзелавы веснік.
8.25. Пад купалам Сусвету.
8.45. Пяць хвілін на жарты.
8.50. Кінанарыс.
9.00. ТБ–школе. Пазакласнае чытанне.
* 9.20. "Чарапашкі ніндзя" 47-я серыя.
◆9.45. "Паласа Сімарона" (ЗША). Фільм 12-ы.
11.00. "АВС-клуб".
11.15. Партрэт на фоне часу. Акцыянернае таварыства "КІМ" г.Віцебск.
◆11.45. "Шчыра Ваш..."
13.10. Фільм-канцэрт.
15.10. "Як нараджаецца музыка?" Хормайстар Галіна Цітова.
15.45. "Нов і К"-топ-10.
16.45. ТБ–школе. Беларуская літаратура.
17.15. "Бімбат".
17.30. Навіны.
17.40. Залатая ініцыятыва. Прапановы бізнесменаў па здабычы золата.
18.10. Абласныя навіны (Віцебск).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Эканамікст.
19.10. Эканамічная хваля.
19.50. Калейдаскоп выставак.
20.05. Актуальнае інтэрв'ю. Прымае ўдзел надзвычайны і паўнамоцны пасол Фінляндыі ў Беларусі Тойста Толванен.
20.30. Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. Надвор'е.
21.55. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння ◆"Маё каханне, мой смутак". Тэлечасопіс.

Канал "Астанкіна"

5.30. Раніца.
6.50, 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 20.00, 22.50. Навіны.
7.00. Працяг праграмы "Раніца".
* 8.00. "Вайна гобатаў".
◆8.25. "Дзікая Роза".
9.25. А.Рэспігі. "Птушкі". Сюіта для аркестра.
◆14.00. "Гарачаў і іншыя".
15.00. Вясёлыя ноткі.
15.30. Паміж намі, дзяўчынкамі.
16.00. Джэм.
◆16.20. "Элен і рабяты".
16.50. Свет сёння.
17.00. "Ведзі".
17.30. Чалавек і закон.
17.40, 20.30. Надвор'е.
17.45. "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". К.Орф.
18.00. Гадзіна пік.
◆18.25. "Дзікая Роза".
18.55. Тэма.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.40. З першых рук.
◆20.50. "Смага".
22.25. Новыя жыхары.
23.05. "Паміж двух азёраў і вышэй за воблакі". Аб народных талентах г.Інтэрлакен (Швейцарыя). У перапынку (23.50)– Прэс-экспрэс.

Канал "Расія"

7.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00. Весткі.
7.20. Патрабуюцца...патрабуюцца...
7.30. Час дзелавых людзей.
8.00. Сусветныя навіны Эй-бі-сі.
8.25. Гандлёвы дом.
8.40. Момант ісціны.
9.35. Чароўны куфэрак.
9.50. Каралеўская міля.
10.35. Тэлегазета.
10.40. Сялянскае пытанне.
◆15.20. "Пірацкі востраў" (Аўстралія). 2-я серыя.
15.45. Там-там навіны.
16.00. Свята кожны дзень.
16.10. Новая лінія.
16.50. Не быць дыназаўрам.
17.05. Галасы.
17.35. Парадак дня.
18.00. L-клуб.
18.50. Ніхто не забыты.
19.25. Падрабязнасці.
19.35. Джаз-клуб. "Вясёлыя рабяты з Англіі".
20.10. Футбол. Кубак УЕФА. "Дынама (Масква)–"Рэал" (Мадрыд).
22.20. Аўтаімгненне.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Экран крымінальных паведамленняў.
22.40. Футбол. Кубак УЕФА. "Нант" (Францыя)–"Тэкстыльшчык" (Камышын). У перапынку – Зоркі гавораць.

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.30. Інфарм ТБ.
12.10. Чароўная лінія.
12.25. "Нямецкая хваля".
12.55, 13.30, 16.40, 19.25. Музычны момант.
13.00. Хуткая дапамога.
◆13.35. "Каміла, ці Нераскрытыя таямніцы".
14.45. "Дом кіно" прадстаўляе: першыя фільмы Мікіты Міхалкова і Сяргея Салаўёва.
15.50. "А калі сустрэнеш тыгра". Тэлефільм.
16.10. Музыка – дзецям.
16.20. "Тры колы, фаліянт і..."
16.45. Наш сусед – Фінляндыя.
17.10. Выбары-94.
17.55. Адкрываю для сябе Расію.
18.50. Спорт, спорт, спорт...
19.10. Вялікі фестываль.
◆19.30. "Каміла, ці Нераскрытыя таямніцы".
20.20. Па ўсёй Расіі.
20.40. Свет мастацтва.
21.10. Тэлемагазін.
21.15. Тэлеслужба бяспекі.
21.45. Спартыўныя навіны.
22.00. Ваш стыль.
22.05. "Мой прапрадзед Пушкін".

8-ы канал

* 18.00. "Рабатэхі".
18.30. Студыя "ІНТЭКС".
18.45. Музычная праграма.
19.10. Пры свечках.
* 19.20. Мультфільм (ЗША).
19.50. БАНТ.
19.55. "Нямецкая хваля".
20.25. Шанц-прыз.
◆20.40. "Шанцы".
21.30. Студыя "БМ".
◆21.50. "З жыцця адпачываючых".

НТВ

* 17.00. Мультфільмы.
17.30. Д/ф.
18.00. "Сёння".
18.35. Спартыўны калейдаскоп.
◆18.55. "У той жа час, у наступным годзе" (ЗША).
21.00. "Сёння".
◆21.35. "Вялікі чалавек".
22.35. Часінка.
23.05. Рэтра-ТБ.

■ 19, серада

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Эканамікст.
8.20. Пад купалам Сусвету.
8.30. Надвор'е.
8.40. Пяць хвілін на жарты.
* 8.50. "Дэілі-Далі ў Мурчынпарку".
9.00. ТБ–школе. Беларуская літаратура.
◆9.30. "Маё каханне, мой смутак".
10.30. Аэробіка.
11.00–11.15. "Бімбат".
16.05. Відзьма-нявідзьма.
17.05. "Бімбат".
17.30. Навіны.
17.40. Якія мы гаспадары?
18.10. Абласныя навіны (Гомель).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Творчае маладзёжнае аб'яднанне "Крок". "Карамболь". Ток-шоу з удзелам маскоўскага мастака Барыса Краснова.
19.30. Крэда.
19.50. У нас дома. Праграма для сям'і.
20.30. Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пяць хвілін на жарты.
21.40. Пад купалам Сусвету.
21.50. Надвор'е.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння –"Маё каханне, мой смутак".

Канал "Астанкіна"

6.50, 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 20.00, 22.50. Навіны.
* 8.00. "Вайна гобатаў".
◆8.25. "Дзікая Роза".
9.00. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
10.00. Амерыка з М.Таратутам.
◆14.00. "Гарачаў і іншыя".
15.00. Паглядзі, паслухай.
16.00. Сіняя птушка.
16.20. "Элен і рабяты".
16.50. Свет сёння.
17.00. "Міждзяржаўная тэлерадыёкампанія "Мір".
17.30. Мініяцюра.
17.40, 20.30. Надвор'е.
17.45. "Хто ёсць хто?" XX стагоддзе". Д.Туту.
18.00. Гадзіна пік.
◆18.25. "Дзікая Роза".
18.55. У пошуках згубленага. Л.Арлова.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.40. Маналог.
20.50. Футбол. Ліга чэмпіёнаў. "Спартак"(Масква)–"Баварыя"(Мюнхен).
23.00. Максіма.
23.20. Прэс-экспрэс.
23.30. Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Агляд 9-ці матчаў.

Канал "Расія"

7.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00. Весткі.
8.00. Сусветныя навіны Эй-бі-сі.
8.25. Гандлёвы дом.
◆8.40. "Санта-Барбара".
10.00. Пушкінскі дом.
10.40. Сялянскае пытанне.
15.20. Студыя "Рост".
15.50. Там-там навіны.
16.05. Свята кожны дзень.
16.15. Тэлегазета.
17.00. М-трэст.
17.15. Казкі для бацькоў.
17.45. Асеннія вяселлі.
17.55. Рубяжы.
18.10. Фільм-прэм'ер.
18.25. Залатая шпора.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Санта-Барбара".
20.25. Астралогія кахання. С.Захараў.
21.00. "60 хвілін".
22.20. Аўтаімгненне.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Экран крымінальных паведамленняў.
22.40. Майстры. Скульптар Ю.Арэхаў.
23.25. Зоркі гавораць.

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.30. Інфарм ТБ.
12.10. Чароўная лінія.
12.25. "Нямецкая хваля".
12.55, 13.30, 16.45, 19.25. Музычны момант.
13.00. Хуткая дапамога.
◆13.35. "Каміла, ці Нераскрытыя таямніцы".
* 14.20. "Маленькія цуды".
◆14.45. "Пырскі шампанскага".
16.20, 21.10. Тэлемагазін.
16.25. Сем пятніц на тыдні.
17.10. Выбары-94.
17.55. Гістарычны альманах.
18.50. Спорт, спорт, спорт...
19.10. Вялікі фестываль.
◆19.30. "Каміла, ці Нераскрытыя таямніцы".
20.15. Блеф-клуб.
20.50. "Граф Нулін". Главы з рамана А.С.Пушкіна чытае С.Юрскі.
21.15. Тэлеслужба бяспекі.
21.45. Спартыўныя навіны.
22.00. Ваш стыль.
22.05. "Бог і помач вам, сябры мае...".

8-ы канал

* 18.00. "Рабатэхі".
18.30. Музычная праграма.
18.50. "Навіны".
19.00. "Нямецкая хваля".
* 19.30. Мультфільм ЗША.
20.00. Агенцтва "Пармікс".
20.15. Прэм'ера.
◆20.40. "Шанцы".
21.30. Студыя "БМ".
◆21.50. "Бар'ер".

НТВ

* 17.00. Мультфільм.
17.30. Д/ф.
18.00. "Сёння".
18.35. Хакей з Яўгенам Маёравым.
◆19.00. "Дуэт для салісткі" (ЗША).
21.00. "Сёння".
◆21.35. "Чыста англійскі поспех". 1-я серыя.
22.35. Часінка.
23.05. Кафэ "Абломаў".

Каб зэканоміць ваш час:
◆ мастацкія фільмы
* мультфільмы

Надвор'е

Сёння днём па рэспубліцы чакаецца пераменная воблачнасць без ападкаў. Тэмпература паветра ў Віцебску — 0— +2°, Магілёве, Мінску — +1— +3°, Гродна, Гомелі — +2— +4°, Брэсце — +3— +5°.

У наступныя двое сутак захаваецца халоднае, без істотных ападкаў надвор'е. Тэмпература паветра ўначы — -2— -7°, днём — -1— +4°.

Валянціна СКРЭБЕЦ, інжынер-сіноптык Белгідрамета.

Ільготны праязны білет, выдадзены на імя Дубовік Р.І., лічыць несапраўдным.

Дзяжурны рэдактар Вера ШЧЭЦІНА. Стыльрэдактар Валянціна СКАРЫНКІНА.

Заснавальнікі: ЦК СМБ, калектыў рэдакцыі газеты "Чырвоная змена". Выдавец: газетна-выдавецкае закрытае акцыянернае таварыства "Маладняк", 220013 г.Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. [illegible] Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку", 220013, г.Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79. Выходзіць у аўторак, чацвер і суботу.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў. [illegible]

Нумар падпісаны ў друк: па графіку — 19.20, падпісана — 19.20.

М. 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П. 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Індэкс 63129. [illegible]

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013 г.МІНСК, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: [illegible]

РЭКЛАМНАЯ СЛУЖБА — [illegible]

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Сяргей БАЛЦЭВІЧ (адказны сакратар), [illegible]

Галоўны рэдактар Уладзімір БЕЛЬСКІ